ЛАМБАРДЫ ПЕРАТВОРАЦЬ У КАМІСІЁНКІ?

2

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ «РЫТУАЛЬНЫХ» МАХЛЯРОЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛІСТАПАДА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 209 (29076)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:

«Мы ўзялі пад строгі кантроль фарміраванне цэн, складанне меню, выкананне натуральных і грашовых нормаў. Аднак у некаторых правяраемых установах яшчэ не да канца выконваюцца санітарна-гігіенічныя нормы, адсутнічае альбо няякасна вядзецца адпаведная дакументацыя, завышаюцца цэны на прадукцыю, якая пастаўляецца, і гатовыя стравы, дзесьці недаважваюць ці недакладваюць. Да нядаўняга часу ў асобных школах дзейнічалі розныя рацыёны для дзяцей са шматдзетных сем'яў і дзяцей, якія харчуюцца за даплату бацькоў. Гэта недапушчальна. Дзеці павінны харчавацца аднолькава».

КАРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указы аб ратацыі ў кіраўніцтве ўпраўленняў Следчага камітэта.**
- Віцебскаму медыцынскаму ўніверсітэту сёння спаўняецца 85 гадоў. З гэтай нагодай калектыў ВНУ павіншаваў кіраўнік дзяржавы.
- **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту ў студзені — верасні 2019 года склаў Br2,7 млрд.**
- Нацыянальная школа пілотаў можа быць створана ў Беларусі.
- **Курс па дрон-журналістыцы адкрыюць на журфаку БДУ.**
- Грамадзянін Украіны схаваў ад мытнага кантролю больш за 1,5 тысячы рыбалоўных прынад у схованках свайго аўтамабіля.

ISSN 1990 - 763X

МАЛАЯ РАДЗІМА БАБУЛІ ГАННЫ

Жыхарцы вёскі Казлы Сенненскага раёна Ганне КАМАРОВАЙ ідзе восемдзесят сёмы год. Яна тут найстарэйшая і, адначасова, наймаладзейшая, таму што Ганна Трафімаўна, былы калгасны аграном, у вёсцы адзіны жыхар. Вядома, летам, на сваю радзіму прыязджаюць дачнікі, але ў другой палове восені яны зноў замыкаюць хаты і з'язджаюць у горад. А бабуля Ганна не хоча пакідаць сваю малую радзіму і зімовая адзінота яе не надта хвалюе. Па-ранейшаму яна рухавая, з ахвотай працуе ў агародзе, любіць наводзіць парадак на падворку, чакае дзяцей і ўнукаў. Вёска знаходзіцца на аўтамабільнай трасе, двойчы на тыдзень прыязджае аўталаўка, не забываюць наведваць жанчыну і дачнікі. Вось і Ірына ДУБРОЎСКАЯ *(на гэтым фота злева)*, калі прыязджае з Віцебска, заўсёды заходзіць да пенсіянеркі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Цікавае пытанне

Эліза Ажэшка, Міхась Васілёк ці Ян Каханоўскі?

Імёны якіх славутых жыхароў Гродна трапілі ў першы спіс гісторыка-культурнай спадчыны

Усе яны пахаваны на могілках, якія лічацца самымі старымі ў Беларусі. Тут ёсць помнікі, якія датуюцца нават XVIII стагоддзем. Але ўнесці гарадскі некропаль у спіс гістарычных каштоўнасцяў немагчыма, бо ён яшчэ дзеючы. Таму абласны савет па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны прыняў беспрэцэдэнтнае рашэнне — надаць такі статус не ўсяму аб'екту, а толькі некаторым помнікам. І вось хто апынуўся ў гэтым спісе...

СТАР. 4

Падзея

ПРАЗ ЦЕРНІ ДА РАДАСЦІ

Сёння ў Мінску адкрываецца кінафестываль «Лістапад»

Абодва папярэднія фільмы Крысціны Грозевай і Петара Вылчанава — «Урок» і «Слава» — удзельнічалі ў конкурснай праграме Мінскага міжнароднага кінафестывалю, і абодва атрымалі важкія ўзнагароды. Першы быў удастоены «Золата Лістапада», другі — Прыза глядацкіх сімпатый. Трэцяй сумеснай работай балгарскіх рэжысёраў «Бацька», між іншым, лаўрэатам Міжнароднага кінафестывалю ў Карлавых Варах, сёння ў сталіцы адкрыецца кінафестываль «Лістапад». Першыя кінапаказы, урачыстая цырымонія адкрыцця і сімвалічна разбітая аб штатыў кінакамеры талерка — тыдзень добрага кіно пачынаецца.

Больш за 150 фільмаў, шэсць конкурсных праграм, каля пяцідзесяці краін вытворчасці з дэбютам на «Лістападзе» карцін з Судана і Сенегала — першыя паказы кінафестывалю пачынаюцца ўжо сёння, прычым на некаторыя з іх, як на «Дзяржаўнае пахаванне» Сяргея Лазніцы, квіткі раскупленыя праз некалькі дзён пасля старту продажу.

Не знойдзеш білетаў і на фільм адкрыцця «Бацька», які на афіцыйнай цырымоніі адкрыцця кінафестывалю ў кінатэатры «Масква» будзе прызначаны сведчыць аб пачатку кінатыдня. Па традыцыі на ўрачыстасці апроч іншага ўручаецца прыз Прэзідэнта «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве», у чым галоўны сакрэт цырымоніі, і ў знак таго, што «Лістапад» адкрыты — усё, паехалі, — на сцэне аб штатыў кінакамеры разбіваецца талерка.

СТАР. 5

Блізкая ўлада

СУСЕДСКІЯ СПРЭЧКІ, РАЗВІЦЦЁ ГАРАДСКОЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ, СЯМЕЙНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

На прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэя КУНЦЭВІЧА ў Пружанах запісаліся 22 чалавекі. Многія наведвальнікі прыйшлі з прычыны таго, што не згодныя з рашэннямі судоў розных інстанцый. І гэта самыя цяжкія справы нават для выслухоўвання.

Фота БелТА.

Чалавек не верыць у вінаватасць свайго блізкага. Але ж прысуд можа вынесці толькі суд. Атрымліваецца замкнёнае кола. Калі пройдзены судовыя інстанцыі, толькі Генеральная пракуратура можа яшчэ раз правесці праверку, што і будзе зроблена ў адносінах да асобных спраў пружанскіх заяўнікаў.

Прыватнае прадпрыемства «БелАгароднінаМікс» стала банкрутам. Людзі за доўгі час не атрымалі зарплату. Да Андрэя Кунцэвіча прыйшлі тры былыя работнікі названай арганізацыі. Пытанне разглядаў эканамічны суд. Справа цягнецца ажно пяць гадоў. У грамадзян ёсць рашэнне аб спагнанні грошай з заснавальніка фірмы. Рашэнне ёсць, а грошай няма. Тут вельмі цяжка нешта змяніць. Застаецца спадзявацца, што рашэнне ўсё ж будзе выканана.

Адна з заяўніц выхоўвае дваіх непаўналетніх дзяцей. Доўг па аліментах ад былога мужа складае больш за 8600 рублёў. Яна лічыць, што прымушаць працаваць яго павінны судовыя выканаўцы. Але ж яго ўжо не раз уладкоўвалі, ён нідзе не затрымліваецца. Андрэй Кунцэвіч папрасіў РАУС яшчэ раз вярнуцца да гэтай праблемы.

Прыйшлі на прыём таксама дзве пенсіянеркі, якія скардзіліся адна на адну. Жанчыны маюць па суседстве дамы, і гадамі цягнецца іх узаемная непрыязнасць. Яны пішуць скаргі, звяртаюцца ў суды, ходзяць у выканкам і розныя службы. На прыёме кожная з іх абвінавачвала другую ў хлусні і паклёпах. Самыя розныя службы бывалі ў іх па шмат разоў, але канца гэтай гісторыі не відно, жанчыны не чуюць адна адну. Адна з іх з крыўдай успомніла чарговага работніка міліцыі, які быў уцягнуты ў разбор справы. Яна патрабавала пакараць апанентку, а ён сказаў: «Бог пакарае». І гэта быў, відаць, найлепшы адказ у такой сітуацыі. Бо, на жаль, ледзь не на кожным прыёме бываюць заяўнікі, якія дзеляць з суседзямі метр зямлі, садовыя дрэвы альбо нават магчымасць хадзіць па агульнай дарозе, пры гэтым бачаць толькі свой інтарэс.

Былі на прыёме людзі, якія ўзнімалі пытанне пешаходных дарожак у горадзе, стварэння прытулку для жывёл, запазычанасці па аліментах, выкарыстання чэкаў «Жыллё». Прагучалі прапановы па развіцці веласіпеднага руху ў Пружанах, паляпшэнні асвятлення вуліц.

— Як паказваюць сацыялагічныя зрэзы, выязныя прыёмы грамадзян з'яўляюцца адной з самых дзейсных і запатрабаваных грамадзянамі формаў работы. Яны дазваляюць Адміністрацыі Прэзідэнта бачыць сітуацыю на месцах, аператыўна прымаць рашэнні, — адзначыў у размове з журналістамі Андрэй Кунцэвіч. — Калі чалавек ідзе на прыём, яму гэтае пытанне баліць. Часам важным выглядае выслухаць, даць параду, накіраваць у патрэбную інстанцыю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ БУДЗЕ ДАДЗЕНЫ ГРУНТОЎНЫ АДКАЗ

2 лістапада, у суботу, з 9 да 12 гадзін у аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі кіраўнікоў органаў дзяржаўнай улады з насельніцтвам.

На пытанні, якія хвалююць грамадзян, адкажуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч Барысюк (80162213121);

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч Мацкевіч (80212222222);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч Гарбачоў (80232331237);

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна Бубенчык (80152735644);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Валерый Анатолевіч Малашка (80222501869);

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч Макар (80175004160);

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч Крэпак (80172224444).

Грошы

ЦЯПЕР З ВАС НІЧОГА ЛІШНЯГА НЕ ВОЗЬМУЦЬ

У красавіку ўводзяцца новыя правілы выдачы мікрапазык

Нядаўна Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб прадастаўленні і прыцягненні пазык», які ўводзіць некаторыя абмежаванні для мікрафінансавых арганізацый. Дакумент увойдзе ў сілу 27 красавіка 2020 года. У прыватнасці, памеры пеняў і штрафаў па мікрапазыках абмяжуюць, а ўвядзенне камісій і навязванне дадатковых паслуг — забароняць, паведаміў начальнік Галоўнага ўпраўлення рэгулявання некрэдытных фінансавых арганізацый Нацыянальнага банка Дзмітрый НАБЗДОРАЎ, каментуючы дакумент.

Без дадатковых плацяжоў і камісій

Пасля ўваходжання ўказа ў сілу яго палажэнні будуць распаўсюджвацца не толькі на новыя дагаворы мікрафінансавання, але і на тыя, якія дзейнічаюць. У мікрафінансавых арганізацый будзе яшчэ два месяцы на тое, каб прывесці гэтыя дамовы ў адпаведнасць з новымі патрабаваннямі.

У новым указе выразна прапісаны аб'ём абавязацельстваў пазычальнікаў перад мікрафінансавымі арганізацыямі. Калі чалавек узяў грошы ў пазыку, ён павінен вярнуць асноўную суму, налічаныя працэнты і, калі ёсць пратэрміноўка, могуць быць штраф, пеня, няўстойка. Іншых дадатковых плацяжоў, камісій, павышаных працэнтаў быць ужо не можа.

Абмежаванні не толькі па стаўках, але і па штрафах

Акрамя таго, дадаткова абмежаваны памер працэнтаў і няўстойкі. Гэта зроблена для зніжэння пазыковай нагрузкі на спажыўцоў паслуг мікрафінансавых арганізацый.

Яшчэ ў пачатку мінулага года Нацбанк устанавіў максімальныя стаўкі па мікрапазыках: для фондаў — стаўка рэфінансавання (цяпер гэта 9,5 %), для спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі — дзве стаўкі рэфінансавання (19 %). Цяпер у памерах выплат з'явяцца новыя абмежаванні.

Калі тэрмін пазыкі будзе доўгі, з пастаяннымі пралангацыямі, на гэты выпадак указам прадугледжаны агульныя абмежаванні аб'ёму працэнтаў, якія могуць быць налічаны за ўвесь перыяд карыстання пазыкай. Указам устаноўлена, што за ўвесь тэрмін карыстання пазыкай сума працэнтаў не можа перавысіць двухразовага памеру сумы пазыкі. Таксама абмежаваны і памер штрафаў, пені і няўстоек. Іх сукупны памер за ўвесь перыяд карыстання пазыкай, незалежна ад таго, якія парушэнні дапусціў пазычальнік, не можа перавысіць паловы памеру пазыкі. Гэта адпавядае перадавому міжнароднаму вопыту, у тым ліку і краін-суседзяў.

Прадстаўнік Нацыянальнага банка таксама адзначае, што раней асобныя арганізацыі спрабавалі нарасціць сваю прыбытковасць шляхам навязвання дадатковых сэрвісаў і паслуг. Гэта мог быць, напрыклад, платны дагавор паручыцельства або платны разгляд заяўкі. Новы ўказ такую практыку забароніць.

Ва ўказе прадугледжана права пазычальніка адмовіцца ад падпісання любога іншага дагавора з мікрафінансавай арганізацыяй альбо іншага дагавора з трэцяй асобай, калі гэты дагавор абумоўлівае выдачу пазыкі. У гэтым выпадку арганізацыя абавязаная ўсё роўна прапанаваць кліенту пазыку на такі ж тэрмін у такой жа суме, але памер працэнтаў можа быць іншы, напрыклад, трохі большы. Але не вышэйшы за тыя памеры, якія ўстаноўлены Нацбанкам.

Схаваны лізінг моцна абмяжуюць

Яшчэ адзін від пазык, які ўрэгулюе дакумент, — гэта так званы зваротны лізінг. Некаторыя кампаніі прапануюць такі прадукт: вам патрэбны грошы, вы звяртаецеся па аб'яве «Даём пазыку», а на самай справе за гэтай канторай хаваецца лізінгавая кампанія, якая да класічнага лізінгу мае мала дачынення. Там фармальна купляюць ваш тэлефон і аддаюць яго назад у карыстанне па дагаворы лізінгу. Вынік гэтай здзелкі: у вас на руках грошы — ваша пазыка, якую трэба вяртаць, — а таксама тэлефон, за карыстанне якім вы павінны плаціць, бо ён цяпер не ваш. Грамадзяне, падпісваючы такі дагавор, не заўсёды ўсведамляюць наступствы. Тэлефон належыць лізінгавай кампаніі, і ў выпадку нявыплаты доўгу яго могуць забраць. Памеры штрафных санкцый у некаторых кампаній, на погляд Нацбанка, устанаўліваліся ў завышаным памеры. Пры гэтым усе меры па абароне правоў спажыўцоў мікрафінансавання да дагавораў лізінгу фармальна дачынення не маюць.

Каб не дапусціць такіх сітуацый, указ абмяжоўвае пералік прадметаў лізінгу. Ён будзе магчымы толькі ў дачыненні да маёмасці, якая рэгіструецца, — напрыклад, машыны або нерухомасці.

У гэтым выпадку патрэбныя дадатковыя дзеянні фізічных асоб. Калі чалавек прыедзе ў ДАІ перарэгістраваць аўтамабіль, ён дакладна зразумее, што прадае свой аўтамабіль, а не бярэ грошы ў пазыку пад заклад чагосьці неістотнага.

Як паказала практыка, пад выглядам дагавораў зваротнага лізінгу тэлефонаў, смартфонаў і іншай бытавой тэхнікі грамадзянам фактычна даваліся грошы ў пазыку пад завышаныя працэнтныя стаўкі без належнага інфармавання аб сутнасці заключаных дагавораў. Такія нядобрасумленныя практыкі, мяркуюць у Нацбанку, павінны быць выключаныя.

Фонды ўжо не тыя

У міжнароднай практыцы фонды прыцягваюць сродкі ад міжнародных арганізацый і фактычна даюць грошы на развіццё рэгіёнаў, выпуск нейкіх відаў сельскагаспадарчай прадукцыі, закупку тэхнікі для малога і сярэдняга бізнесу па стаўках рынкавых альбо ніжэйшых за рынкавыя.

Але, на жаль, у нас фонды, заяўляючы асноўным відам сваёй дзейнасці падтрымку культурных каштоўнасцяў альбо павышэнне фінансавай адукаванасці насельніцтва, спрабавалі займацца камерцыйным фінансаваннем па завышаных стаўках. З прычыны гэтага было прынята рашэнне, што некамерцыйнае мікрафінансаванне будзе прадстаўлена выключна такім відам арганізацый, як спажывецкія кааператывы фінансавай узаемадапамогі. Фонды з гэтага спісу выкраслены.

Ламбарды хочуць ператварыць у камісіёнкі

Змены закрануць і дзейнасць ламбардаў. Яны, тлумачаць эксперты, стануць больш падобныя на камісійныя крамы, а не на класічныя ламбарды. У прыватнасці, гэты дакумент пашырае спіс дазволеных відаў дзейнасці для ламбардаў. Апошнія атрымаюць права ажыццяўляць камісійны гандаль, захоўванне рэчаў, скупку рухомай маёмасці для яе далейшай рэалізацыі. Усё гэта павінна дабратворна паўплываць на эканамічны складнік дзейнасці ламбардаў, бо гэтыя віды дзейнасці можна ажыццяўляць пры супастаўных або ніжэйшых аперацыйных выдатках.

Старшыня праўлення Рэспубліканскай асацыяцыі мікрафінансавых арганізацый Іван РАДЗЮКЕВІЧ адзначае, што неабходнасць трансфармацыі ламбардаў наспела досыць даўно.

Маючы на цяперашні момант масу магчымасцяў атрымаць авердрафт, дзіўна звяртацца ў ламбард па кароткія пазыкі. «Але яшчэ з савецкіх часоў у ламбарда ёсць сацыяльная функцыя. Ён патрэбны для таго, каб здымаць сацыяльную напружанасць. Калісьці ламбарды былі ў абавязковым пераліку бытавых паслуг, каб чалавек, у якога больш няма магчымасці ўзяць дзесьці грошай, не пайшоў займацца супрацьпраўнай дзейнасцю, а мог прынесці ў ламбард сваю маёмасць і атрымаць грошы», — тлумачыць Іван Радзюкевіч.

На жаль, у нас пакуль ёсць людзі, якім недаступныя банкаўскія прадукты. Іх становіцца ўсё менш, але, пакуль яны ёсць, ламбарды ў сваім самым прымітыўным выглядзе павінны заставацца. Аднак пасля ўказа гэта будуць ужо хутчэй камісійныя крамы і крамы тавараў, якія былі ва ўжыванні.

Іван Радзюкевіч пералічвае некалькі опцый, якія будуць даступныя ў абноўленых ламбардах. Гэта традыцыйная магчымасць атрымаць пазыку пад заклад сваёй маёмасці, а таксама магчымасць прадаць сваю маёмасць або пакінуць яе на камісійны продаж.

Гэта вельмі добра, таму што ў чалавека з'яўляецца выбар. Яшчэ адно важнае змяненне закране аўталамбарды. Цяпер машынай, здадзенай у ламбард, можна будзе працягваць карыстацца. Гэты аўтамабіль можа не заставацца на стаянцы, якая належыць ламбарду, а карыстальнік можа працягваць ездзіць на сваім аўтамабілі і выконваць абавязацельствы па пазыцы. Эксперты адзначаюць, што дзякуючы такой навіне паслугі ламбардаў могуць патаннець, бо ім не давядзецца аплачваць стаянку.

«Шэрыя» крэдыторы знікнуць?

Прадстаўнік Нацбанка Дзмітрый Набздораў заявіў, што дзяржрэгулятар выдатна разумее: будуць спробы стварыць схемы абыходу Указа № 394. Напрыклад, хтосьці можа прыдумаць ланцужок грамадзянска-прававых дагавораў, каб па факце даваць пазыкі пад больш чым 350 % гадавых. Могуць быць і спробы абыходу абмежаванняў зваротнага лізінгу для фізічных асоб.

«Але мы будзем за гэтым сачыць. Спыняць, калі ў кагосьці атрымаецца зрабіць гэта эфектыўна», — адзначыў спецыяліст.

Мы пацікавіліся: няўжо цяпер перастануць ляпіць аб'явы «грошы ў доўг» на слупах і прыпынках? Нам адказалі: неабавязкова.

— Як правіла, гэтыя людзі не з'яўляюцца мікрафінансавымі арганізацыямі, гэта прыватныя асобы альбо індывідуальныя прадпрымальнікі. Падлічыць іх колькасць складана, таму што яны не ўключаліся ў наш рэестр. Але мы не пакідаем без увагі такія аб'явы і накіроўваем у адпаведнае міністэрства інфармацыю, з тым каб гэтую незаконную рэкламную дзейнасць спыніць, — тлумачыць **Аляксандр ДЗЯДКОЎ, начальнік упраўлення метадалогіі нябанкаўскіх аперацый Нацбанка.**

Новы ўказ наўрад ці зможа спыніць такіх хітруноў, але Нацбанк будзе старацца іх кантраляваць. А найлепшы кантроль зыходзіць ад саміх спажыўцоў, якім пра крэдыты і пазыкі варта памятаць адну ісціну: бярэш чужыя, аддаеш — свае.

Сяргей КУРКАЧ.

Выбары-2019

АЛЬТЭРНАТЫВА БУДЗЕ

У Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу балатуецца 531 кандыдат

Першапачатковая колькасць прэтэндэнтаў на дэпутацкі значок скараціласа на 29 чалавек. Аб гэтым паведаміла журналістам **старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА** пасля пасяджэння камісіі. Пераважная большасць кандыдатаў адмовіліся ад далейшай барацьбы добраахвотна — пры гэтым даводзіць да ведама выбарчых камісій прычыны грамадзяне не абавязаны.

Дзевяць рашэнняў аб скасаванні рэгістрацыі прыняты выбарчымі камісіямі, у асноўным у сувязі з парушэннямі парадку вядзення перадвыбарнай агітацыі, часцей за ўсё — артыкула 47 Выбарчага кодэкса. У прыватнасці, закон забараняе распальванне нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай варожасці, заклікі да звяржэння канстытуцыйнага строю, абразу вышэйшых службовых асоб і іншых кандыдатаў.

Акрамя таго, некаторыя кандыдаты распаўсюджваюць друкаваную прадукцыю без выхадных даных ці праводзяць пікеты з парушэннем закона.

«Некаторыя палітыкі залішне шырока трактуюць дастаткова ліберальныя і дэмакратычныя нормы закона і прыязджаюць праводзіць пікеты, напрыклад, на тэрыторыю іншых гарадоў і рэгіёнаў, дзе не выбіраюцца зарэгістраваныя кандыдаты ў дэпутаты. Гэта спроба некаторых партый максімальна ахапіць сваёй палітычнай дзейнасцю рэгіёны краіны», — растлумачыла Лідзія Ярмошына. Такіх фактаў ужо ўстаноўлена адзінаццаць, пры паўтарэнні кандыдат у дэпутаты рызыкуе пазбавіцца рэгістрацыі.

Упершыню за доўгі час Цэнтральнай камісіі давялося разглядаць скаргу (кандыдата Уладзіслава Сысы) на рашэнне Брэсцкай абласной выбарчай камісіі аб скасаванні рашэння акруговай выбарчай камісіі Брэсцка-Усходняй выбарчай акругі № 3, якая зарэгістравала кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Часцей адмовы сустракаюцца ў сувязі з парушэннем парадку вылучэння.

Цэнтральная камісія адмовіла ў задавальненні скаргі, бо кандыдатура не адпавядае патрабаванню аб пастаянным пражыванні на тэрыторыі краіны. Былы кандыдат у шматлікіх інтэрв'ю пацвярджае факт пражывання ў Польшчы і асабіста не з'яўляўся ні па пасведчанне, ні на пасяджэнні камісій.

Каля 370 кандыдатаў у дэпутаты ўжо адкрылі рахункі для ўтварэння выбарчых фондаў. На думку Лідзіі Ярмошынай, гэта сведчыць аб намеры ісці да канца ў выбарчай кампаніі.

«Не адкрываюць рахункі кандыдаты, якія вагаюцца, — не выключана, што ў далейшым праз іх сыход з выбарчай кампаніі будзе памяншацца колькасць кандыдатаў у дэпутаты», — мяркуе старшыня ЦВК.

Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі адбудуцца 17 лістапада.

Варвара МАРОЗАВА.

Эканоміка

Топ-100 буйных акцыянерных таварыстваў працуюць устойліва

Пра гэта паведаміў учора першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Турчын на «Кастрычніцкім эканамічным форуме»

Ён заявіў, што праграма рэформаў, якую наша краіна рыхтуе разам з Сусветным банкам, знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці, але прасіць фінансавай падтрымкі МВФ для яе рэалізацыі пакуль не плануецца.

— Пэўныя рэчы, якія там закладзеныя, мы ўжо пачынаем рэалізоўваць. І некаторыя з іх не патрабуюць вялікіх укладанняў. У нас ёсць выразны план, і мы пачынаем яго рэалізоўваць, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. Падымаючы пытанне пра лёс праблемных дзяржаўных прадпрыемстваў і іх выжывання ва ўмовах скарачэння дзяржпадтрымкі, першы віцэ-прэм'ер расказаў, што цяпер ідзе размеркаванне іх па катэгорыях на тых, хто працуе ўстойліва, і на тых, хто мае патрэбу ў рэструктурызацыі даўгоў.

Паводле ацэнкі спецыяліста, з першай сотні найбуйнейшых акцыянерных таварыстваў з перавагай дзяржаўнай долі ўсе прадпрыемствы сёння здольныя працаваць у рыначных умовах. Там выбудоўваецца сістэма карпаратыўнага кіравання.

— На мой суб'ектыўны погляд, там няма прадпрыемстваў, якія трэба закрываць. Ёсць тыя, якія працуюць самастойна, камусьці трэба падставіць плячо — і яны пойдуць далей. Падкрэсліваю, гаворка не ідзе аб новай дзяржпадтрымцы. Важна, каб ва ўсіх было дакладнае разуменне гэтага. Магчыма, дзесьці будзе рэструктурызацыя запазычанасці. Але ніякіх новых выдзяленняў грошай не будзе.

Што датычыцца сістэмы сацыяльнай падтрымкі, то на люты наступнага года намечана распрацоўка новага закона аб занятасці. «Пэўныя рашэнні мы паспрабуем імплементаваць у гэтым дакументе, у тым ліку нашы прапановы па падтрымцы грамадзян, якія апынуліся ў складанай сітуацыі, звязанай з работай», — сказаў Аляксандр Турчын. Самым балючымі ў рамках рэалізацыі праграмы з Сусветным банкам павінны стаць пытанні аплаты камунальных паслуг насельніцтвам. Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што выхад на 100 % аплаты ацяплення, напрыклад, запланаваны толькі на 2026 год. «Да гэтага пытання трэба падыходзіць асцярожней за ўсё, улічваць, як яно ўспрымаецца насельніцтвам», — адзначыў ён.

Акрамя гэтага, у сваім выступленні першы намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што пытанні танных вуглевадародаў перастаюць быць крытычнымі для выжывання эканомікі.

«Мы ў цэнтр усёй эканамічнай палітыкі ставілі пытанні барацьбы за танныя нафту і газ, і гэта было натуральна. Цяпер мы бачым, што не толькі для развіцця, але і нават для выжывання эканомікі гэтыя пытанні перастаюць быць крытычнымі. Развіццё тэхналогій павольна, але няўхільна адводзіць ролю вуглевадародаў з першага плана на другі», — сказаў Аляксандр Турчын.

Сяргей КУРКАЧ.

Запрашальнік

У Гродне пройдзе міжнародны турнір памяці Аляксандра Курловіча

Спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы адбудуцца ў Лядовым палацы абласнога цэнтра з 2 да 4 лістапада.

Турнір носіць статус адборачнага да летніх Алімпійскіх гульняў у Токіа. Барацьбу за ўзнагароды будуць весці прадстаўнікі Азербайджана, Албаніі, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Ізраіля, Італіі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Малдовы, Польшчы, Расіі, Румыніі, Славакіі, Узбекістана, Украіны і Уругвая.

Са славутых замежных атлетаў у Гродна плануюць прыехаць алімпійскія чэмпіёны 2016 года Лаша Талахадзэ з Грузіі і Ніжат Рахімаў з Казахстана, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 2016 года Гор Мінасян з Арменіі. Беларускую каманду прадставяць многія вядучыя атлеты: Яўген Ціханцоў, Пётр Асаёнак, Вадзім Ліхарад, алімпійскі чэмпіён Андрэй Арамнаў, Аляксандр Берсанаў, сярэбраны прызёр Гульняў у 2016 годзе Дар'я Навумава.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Надвор'е

КРОК У ЗІМУ, ДВА — У ВОСЕНЬ

Пасля рэзкага значнага пахаладання ў нас будзе зноў цёплае, але вільготнае надвор'е

У першай дэкадзе лістапада пацяплее, тэмпература паветра будзе падымацца да 16 градусаў цяпла, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А як было страшна, калі на гэтым тыдні ўварванне арктычнага паветра істотна панізіла тэмпературны рэжым. Няўжо зіма прыйшла? Не, пакуль не. Ужо на гэтыя выхадныя атлантычныя паветраныя масы выцесняць халоднае паветра, і ў пачатку наступнага тыдня чакаецца цёплае надвор'е з кароткачасовымі дажджамі.

Пасля халоднага чацвярга, адпускаць пачне ўжо ў суботу. У гэты дзень надвор'е будзе ў асноўным вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы ў асобных раёнах Віцебскай вобласці, а ўдзень месцамі па захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах краіны магчымы парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла, пры праясненнях панізіцца да 7 марозу. Удзень будзе 1—7 градусаў вышэй за нуль, а па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 10 градусаў.

Істотна пацяплее ўжо ў нядзелю. Надвор'ем будзе кіраваць франтальны раздзел, які ссоўваецца з боку Заходняй Еўропы, за ім пачне распаўсюджвацца цёплая паветраная маса. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы па ўсходзе чакаецца мокры снег, слабы галалёд. Уначы і раніцай месцамі захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 2 градусаў. Удзень будзе 6—12 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 13—15 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

ru.delfi.lt

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Зяленскі заявіў, што Украіна гатовая паскорыць падрыхтоўку да членства ў НАТА

Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі заявіў, што Кіеў гатовы да яшчэ больш цеснага супрацоўніцтва з НАТА, чым раней.

«Мы гатовыя яшчэ больш цесна супрацоўнічаць з альянсам і паскорыць падрыхтоўку да членства ў НАТА, — сказаў ён па выніках пасяджэння ў Кіеве камісіі Украіна—НАТА. — Мы гатовыя ўжо сёння практычнай работай даказваць, што Украіна заслугоўвае такога фармату стасункаў». Паводле слоў Зяленскага, на пасяджэнні ў Кіеве была дасягнутая дамоўленасць па абноўленым пакеце сумесных праектаў.

«Мы таксама абмеркавалі перспектывы нашага супрацоўніцтва ў рамках Праграмы пашыраных магчымасцяў НАТА, — працягваў прэзідэнт Украіны. — Я даказаў сёння, што Украіна ўжо гатовая выйсці на гэты новы ўзровень партнёрства з альянсам. Мы таксама працягнем агульныя намаганні па ўмацаванні бяспекі і стабільнасці ў чарнаморскім рэгіёне. Будзем нарошчваць абмен інфармацыяй, развіваць лініі камунікацый, актывізуем правядзенне агульных вучэнняў».

Улады Японіі адновяць знішчаны агнём замак са Спіса ЮНЕСКА

Урад Японіі мае намер аднавіць знішчаны пажарам замак Сюры ў горадзе Наха на паўднёвым востраве Акінава, які ўваходзіць у Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Пра гэта заявіў генеральны сакратар кабінета міністраў Ёсіхідэ Суга.

«Гэта трагічнае падзея. Урад прыкладзе ўсе сілы да аднаўлення замка», — адзначыў Ёсіхідэ Суга.

Пажар успыхнуў у замку мінулай ноччу. У яго ліквідацыі было задзейнічана больш за 20 пажарных разлікаў. Узгаранне ўдалося ліквідаваць праз дзевяць гадзін пасля таго, як яно пачалося, аднак у некаторых месцах агонь працягваў тлець яшчэ амаль суткі.

У выніку пажару знішчаны галоўны, паўночны і паўднёвы карпусы палацавага комплексу, які служыў некалькі стагоддзяў рэзідэнцыяй каралёў Рукю, што кіравалі Акінавай да моманту яе далучэння да Японіі ў 1879 годзе. Паводле апошняй інфармацыі, ніхто не пацярпеў. Прычыны інцыдэнту яшчэ трэба будзе высветліць. Замак Сюры быў пабудаваны ў XIV стагоддзі. У 2000 годзе ён уключаны ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Удава Кабзона папрасіла суд прызнаць банкрутам бізнесмена, які завінаваціўся $25 млн яе мужу

Удава народнага артыста СССР Іосіфа Кабзона Нінэль Кабзон звярнулася ў Арбітражны суд Масквы з просьбай прызнаць банкрутам бізнесмена Вагіфа Пейсахава, які завінаваціўся спеваку $25 млн.

У 2016 годзе Адзінцоўскі суд Маскоўскай вобласці прысудзіў да шасці гадоў калоніі Пейсахава за махлярства на $25 млн, якія ён пазычыў у Кабзона. Як устаноўлена судом і следствам, бізнесмен неаднаразова пазычаў у артыста грошы нібыта на развіццё бізнесу. Кабзон у лютым 2014 года заключыў з даўжніком дзве дамовы пазыкі на агульную суму 25 мільёнаў долараў.

Праз месяц Пейсахаў паведаміў артысту, што не можа аддаць яму грошы, бо прайграў іх у покер, пасля чаго Кабзон звярнуўся ў паліцыю, дзе па гэтым факце была ўзбуджана крымінальная справа. У ходзе расследавання было ўстаноўлена, што Пейсахаў і не збіраўся вяртаць грошы і проста ўводзіў Кабзона ў зман.

Эліза Ажэшка, Міхась Васілёк ці Ян Каханоўскі?

НА СКРЫЖАВАННІ ВУЛІЦ АНТОНАВА І ПРЫГАРАДНАЙ

Менавіта тут знаходзіцца самы стары некропаль у краіне. Як расказаў **супрацоўнік Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея Андрэй ВАШКЕВІЧ**, у старых могілак нават ёсць дакладная дата заснавання — 1792 год. Праўда, гэта датычыцца каталіцкай часткі, якую ад праваслаўнай аддзяляе вузкі праезд. Але ўвогуле старыя могілкі лічацца адзіным комплексам. Самыя старыя пахаванні датуюцца канцом XVIII — пачаткам XIX стагоддзя.

— Да гэтага людзей хавалі каля манастыроў, касцёлаў, цэркваў, гэта былі прыхадскія могілкі, пра што сведчаць і раскопкі каля той жа Каложы, — расказвае Андрэй Вашкевіч. — Сойм Рэчы Паспалітай, які засядаў у 1788—1792 гадах, прыняў рашэнне стварыць камунальныя могілкі за межамі гарадоў. Тады і былі заснаваны самыя каштоўныя на сённяшні дзень некропалі ў Варшаве, Львове, а таксама ў Гродне.

Цяпер фармальна стары некропаль не дзейнічае, ён быў закрыты ў 1970-х гадах. Але фактычна пахаванні ўсё ж адбываюцца. Згодна з законам, родных можна хаваць каля магіл сваякоў ці ў саміх гэтых магілах. Да таго ж тут дзейнічаюць прыходскія храмы.

«АЖЫЎШАЯ» ГІСТОРЫЯ

Старыя помнікі можна пазнаць па іх незвычайным выглядзе.

Можна ўбачыць надмагіллі з самых розных матэрыялаў: пясчаніку, мармуру, чыгуну, жалеза, граніту. Па стылі тут і рамантыка, і міжваенны канструктывізм, і эклектыка. Даволі шмат сімвалічных элементаў, якія раскажуць пра гісторыю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва хрысціянства.

— Напрыклад, вянок з сухацветаў. Гэтыя кветкі, згодна з антычным паданнем, звязвалі свет жывых і памерлых. Можна заўважыць плюшч, які сімвалізуе веру, — ён расце паўсюдна, і тут акамяней. Даволі часта можна ўбачыць выяву якара — сімвала надзеі, — расказвае Андрэй Вашкевіч.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як правіла, такія дэкаратыўныя помнікі ставілі славутым гараджанам. Напрыклад, вядомаму інжынеру Васілю Небальсіну ўстаноўлена пліта з выявай лапаты і сякеры — сімвалаў інжынернай службы. Дарэчы, ён аўтар праекта будынка жаночай Марыінскай гімназіі, дзе цяпер месціцца галоўны корпус ГрДУ імя Я. Купалы. Скульптурная кампазіцыя з жаночай постаццю і стараславянскім тэкстам на пліце ўпрыгожвае магілу сям'і Кемарскіх. Канстанцін Кемарскі — гродзенскі ўрач-акушэр, які ў 80-х гадах XIX стагоддзя арганізаваў акушэрска-фельчарскую

школу. Непадалёк знаходзіцца магіла купца Мураўёва, дом якога на Савецкай плошчы вядомы кожнаму гродзенцу. Манументальна выглядае помнік з дзвюма калонамі генералу Сяргею Ланскому, герою вайны 1812 года. Шэф Беларускага гусарскага палка быў смяротна паранены ў Францыі, але яго прывезлі, каб пахаваць у Гродне. У Гродзенскім некропалі знайшлі вечны прытулак пісьменніца Эліза Ажэшка, заснавальнік заапарка Ян Каханоўскі, прыдворны архітэктар Джузэпе Сака, а таксама чыноўнікі, мэры горада, вядомыя асобы.

Многія старажытныя помнікі нагадваюць каменныя сады. Іх рабіў вядомы на той час скульптар Браніслаў Шышкевіч. Але пражыў ён нядоўга, усяго 29 гадоў, і на яго магіле таксама стаіць каменнае дрэва, якое ён сам сабе і зрабіў. На жаль, многія помнікі з цягам часу і пры «дапамозе» вандалаў страчваюць свой велічны выгляд. І ўсё ж некропаль не застаўся без увагі. Гродзенскія ўлады прынялі кампраміснае рашэнне па выратаванні гістарычнага аб'екта.

ПАД АХОЎНЫМ СТАТУСАМ

Паколькі аб'ект усё ж такі дзеючы, хоць і лічыцца закрытым, яго немагчыма ўключыць у спіс гісторыка-культурнай спадчыны, паведаміла **начальнік управління культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена КЛІМОВІЧ**. Таму было прапанавана ў гэты спіс заносіць адзінкавыя помнікі.

— Мы вырашылі рухацца крок за крокам па шляху надання некропалю ахоўнага статусу і ўносіць у спіс па некалькі надмагілляў, — патлумачыла сітуацыю сураз-моўніца. — Чым мы кіраваліся? Гэта вядомыя людзі і па-мастацку аформленыя помнікі, якія нядрэнна захаваліся. Некаторыя прывялі ў добры стан валанцёры пры дапамозе сучасных тэхналогій. Гэта даволі важны аспект, бо аднаўляць помнікі ў ахоўным статусе вельмі складана, таму добра, што работу правялі раней.

Такім чынам, у спіс увайшлі 10 помнікаў. У іх ліку магілы Кемарскіх, Мураўёвых, Шумавых (бацькоў вядомага парыжскага фотамастака Пятра Шумава), камандзіра Петразаводскага палка Івана Верчыка, Элізы Ажэшкі з мужам, галоўнага мытніка пачатку XX стагоддзя Аляксандра Шырмы і іншых. У гэтым спісе і помнік маці паэта Максіма Багдановіча, якая пражыла ўсяго 27 гадоў. На яе магіле ўстаноўлены гранітны помнік-валун. Вось толькі надпіс на ім ужо не разабраць — літары поўнасцю сцёрліся...

— Гэты спіс будзе папаўняцца, — кажа Алёна Клімовіч. — Мы паступова бяром яшчэ некалькі помнікаў, якія па сваёй захаванасці, гістарычнай значнасці могуць прэтэндаваць на ўключэнне ў спіс гістарычных каштоўнасцяў, затым будзем дапаўняць. Таму што сёння могілкі — такое месца, якое ва ўсім свеце з'яўляецца і захавальнікам гісторыі, і ўражвае мастацкімі асаблівасцямі. Гэта таксама выклікае інтарэс у турыстаў.

ПАТРЭБНЫ КАТАЛОГ І ВІДЭАКАМЕРЫ

Каб надмагілле трапіла ў ахоўны спіс, яно павінна мець «пашпарт». Таму напачатку была праведзена часткавая інвентарызацыя некропаля. Штосьці было зроблена яшчэ ў 90-х гадах, калі аб'ект знаходзіўся ў спісе помнікаў абласнога значэння (пазней гэты статус быў ліквідаваны). У рэспубліканскім рэестры гродзенскага некропаля ўжо не аказалася. А за некалькі дзесяцігоддзяў многія напрацоўкі па могілках страчаны, не маюць сістэмнага апісання, электронных версій.

Але справа не стаіць на месцы. У хуткім часе пачнецца рэалізацыя трансгранічнага праекта з польскім бокам, падчас якога мяркуецца зрабіць грунтоўную інвентарызацыю некропаля.

— Работы плануем распачаць налета. Па заканчэнні праекта мы зробім поўную інвентарызацыю могілак да 1970-х гадоў, а гэта каля тысячы помнікаў, з фотафіксацыяй, апісаннем і кароткай біяграфіяй людзей, якія там пахаваны. У рамках праекта мяркуецца выданне пуцяводніка па могілках на некалькіх мовах. Затым будуць шукацца сродкі на рэстаўрацыю найбольш старажытных пахаванняў. Тут значныя спадзяванні ўскладаюцца на спонсараў, — кажа Андрэй Вашкевіч.

Зразумела, што ўсе гэтыя намаганні паўплываюць на рост турыстычнай прывабнасці аб'екта. Між іншым, ён і зараз цікавы для турыстаў, але яго трэба рэгулярна чысціць, рабіць вырубку зелля і кустарнікаў, праз якія нельга падысці да некаторых старажытных помнікаў. Другая праблема — ахова могілак. Андрэй Вашкевіч лічыць, што іх неабходна абсталяваць сістэмай відэаназірання. Ён згадвае, як некалькі гадоў таму былі выпадкі вандальскага крадзяжу чыгунных элементаў. Ніхто не гарантуе, што гэтыя факты не паўторацца.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Неасабісты суб'ектыў

МАЕ АСЯНІНЫ

Што нас трымае на гэтай зямлі

На мінулыя выхадныя на нашых вясковых могілках было нібы ўвесну перад Радаўніцай — процьма машын, яшчэ больш людзей. Парадкавалі на магілах, зграбалі апалае лісце і сухую траву. Шчыравалі і камунальнікі — прыбіралі вакол агульнай агароджы, высякалі хмызнякі ў старой закінутай частцы, дзе паўрасталі ў зямлю пакрытыя мохам камяні з ледзь бачнымі літарамі. Паспяшаліся да родных магіл і мы — 1 лістапада ў каталікоў Усе святыя, будзе хадзіць ксёндз, будзе шмат людзей, таму павінна быць чыста, бы ў хаце. Так у нашай мясцовасці было спрадвеку, нават у самыя атэістычныя часы. Адзін з самых містычных успамінаў далёкага ўжо дзяцінства — дрыготкія агеньчыкі на могілках у маўклівай восеньскай цемры. У пачатковых класах мы вучыліся ў другую змену, вярталіся дадому вечарам, і дарога ішла міма могілак. Свечкі, запаленыя на Усе святыя на магілах, калі надвор'е было марозна-ціхае, павольна дагаралі дацямна, і нам малым здавалася з дарогі, што яны яшчэ і перамяшчаюцца ў цемры. Мы прыгаломшанай чародкай збіваліся каля нашай Ганны Еўдакімаўны і разам з ёй прыспешвалі хаду, ніводным гукам не парушаючы гэту цішыню...

У старэйшых класах, адвучыўшыся ўжо ў першую змену, 1 лістапада забягалі з дзяўчатамі на могілкі самі. Ва ўсіх там быў нехта свой — у вёсцы, дзе жыве не адно пакаленне роду, дзеці з маленства «багацейшыя» на пахаваных побач сваякоў... Не асабліва задумваліся аб сэнсе, аб сутнасці — проста рабілі так, як бацькі, як суседзі, якія і самі ў той час, пэўна, толкам не маглі растлумачыць, навошта і чаму менавіта ў гэты дзень. Як не разбіраліся і не разважалі, хто дзе хрышчаны, і ці хрышчаны наогул...

Ужо апынуўшыся ў Мінску якраз тады, калі людзі пачалі хадзіць у зноў адчыненыя храмы, даведалася, што ў першыя два дні лістапада — на Усе святыя і ў Задушны дзень, каталікі моляцца за спачын сваіх памерлых. Што ёсць такі памінальны дзень і ў праваслаўных — бацькоўская Дзімітраўская субота — першая субота перад 8 лістапада, калі цэлы дзень моляцца за памерлых, а свечку за спачын можна паставіць у любым месцы храма. А ў народнай традыцыі гэтыя дні называюць Дзяды, Асяніны, і, сабраўшыся ўвечары за сталом усёй сям'ёй, згадваюць усіх памерлых продкаў і клічуць іх да сябе на вячэру, просячы аб заступніцтве...

Напэўна, няма больш у свеце такога пачатку лістапада, як у Беларусі. Тры традыцыі — дзвюх асноўных канфесій і народная — настолькі шчыльна перапляліся ў нашай свядомасці, што адну ад другой ужо не аддзяляеш. Дый ці не кожны з дзяцей гэтай зямлі, калі спытаеш у яго, чаму гэтага не робіш, здзіўлена спытае: «А навошта?» Амаль ва ўсіх ёсць у радні і праваслаўныя, і каталікі, многія памятаюць ад бабуль традыцыю паклікаць Дзядоў на вячэру, а хтосьці свядома адраджае яе нанова ў сваёй сям'і. Пакуль у «цывілізаваным свеце» народ рыхтуецца да Хэлоўіна, робячы пачварныя маскі і касцюмы монстраў, у нас іншыя клопаты: прыбрацца на могілках, запаліць у касцёле лампадку, падаць запіскі ў царкву, арганізаваць дамашніх на вячэру. Мо таму і той жа модны Хэлоўін у нас не прыжыўся і не прыжывецца, пэўна, ніколі — за трыццаць гадоў ён так і не выйшаў за межы некалькіх начных клубаў ды яшчэ, можа, некаторых студэнцкіх інтэрнатаў. Дый там вяленька, без энтузіязму. Чужое. Не наша. І галоўнае — ёсць сваё. Нашмат больш важнае. Чаму — можа, і не зусім зразумела. Але на падсвядомым узроўні адчуваеш: не адмовішся, не выкінеш з жыцця. Проста не зможаш гэтага зрабіць.

...Сёння на нашых вясковых могілках, дзе ляжаць і каталікі, і праваслаўныя, зноў будуць трымцець агеньчыкі. Калі не будзе ветру — дык і дацямна. Там ціха-ціха і чысценька, нібы ў хаце, і ад гэтага ведання спакойна на душы... А яшчэ сёння трэба зайсці ў царкву, падаць памінальную запіску, нават дзве. Праваслаўных сваякоў шмат — у мамы была вялікая радня, на адзін лісток усе імёны не напішаш. А заўтра, у суботу з раніцы — у Дзімітраўскую суботу, зноў зайсці туды, паставіць свечкі, памаліцца за іх спачын... Адтуль — у касцёл, купіць лампадку, запаліць яе на вуліцы перад храмам — у Задушны дзень робяць і так: шмат людзей. Памаліцца за каталікоў — бацькаву радню... Пасля ўвечары накрыць стол, запаліць свечку, паклікаць іх усіх: «Святыя дзяды, клічам вас, хадзіце, ляціце да нас!»

Заўтрашні дзень пройдзе менавіта так, і ніяк інакш. Гэта як падмурак. Як апора, якую не ты прыдумаў, але якая цябе надзейна трымае. Прынамсі на гэтай зямлі. А на іншай... А ці патрэбна яна, іншая?

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ПАМЯЦІ КАМПАЗІТАРА

Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі выступіў з праграмай на малой радзіме кампазітара Ігара Лучанка — у Мар'інай Горцы. Раённы Дом культуры сабраў шмат гасцей, жыхароў райцэнтра, аматараў творчасці Ігара Лучанка.

Падчас канцэрта прагучалі добра вядомыя беларусам песні на музыку знакамітага творцы: «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Полька беларуская», «Зачарованая мая», «Бераг юнацтва», «Дударыкі» і шмат іншых. Гэтыя шэдэўры музычнага мастацтва выканалі салісты заслужанага калектыву Наталля Тамела, Валерыя Грыбусава, Ягор Шаранкоў, Алеся Дзяржавец, Таццяна Глазунова, Дзмітрый Качароўскі, Галіна Грамовіч, Руслан Мусвідас, Аляксандр Салаўёў, Яўген Цымбаліст.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

У РАСІІ НА ТРАСЕ ЗАГІНУЛІ СУАЙЧЫННІКІ

У ДТЗ на трасе М1 у Расіі загінулі грамадзяне Беларусі. Пра гэта ў сацсетках інфармуе пасольства Беларусі ў Расіі.

«Раніцай на 441-м кіламетры трасы М1 адбылося ДТЗ з удзелам грамадзян Беларусі. У выніку трое загінулых, адзін пацярпелы. Пасольства робіць захады па інфармаванні сваякоў», — расказалі ў беларускай дыпмісіі. Удакладняецца, што сутыкненне мікрааўтобуса Volkswagen і велікагруза DAF адбылося прыблізна ў 7.10 каля вёскі Бадуны Краснінскага раёна. У МЗС Беларусі выказалі спачуванні сем'ям і блізкім загінулых.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НА «ДЗЯРЭЎНЮ» ДА ЦЁТАЧКІ...

Гэтую гісторыю ў вёсцы памятаюць да сёння. Збяруцца, бывала, бабулі ў якой-небудзь хаце і...

Усяго ім хапіла: разам працавалі, разам гаравалі, сварыліся, мірыліся, спраўлялі вяселлі, хрэсьбіны... Гэта цяпер іх у вёсцы як кот наплакаў, а некалі ж і людна было, і весела. Вось хоць бы Дар'ю ўзяць. Адна гаравала — гадавала сваіх сыноў, а ніколі ж не ныла, не казала, што цяжка... Хлопцы яе нядрэннымі выраслі. Змалку прывучаліся да працы — дапамагалі па гаспадарцы і маці, і суседзям...

Але ж вось найстарэйшага ўсёй вёскай праводзілі ў войска, вось паштальёнка стала прыносіць матулі пісьмы.

Цешылася Дар'я: Алёшка яе ні на што не скардзіўся, з часам даслужыўся да малодшага сяржанта. З дня на дзень павінен быў вярнуцца дахаты, маці чакала...

У тую раніцу яна, як заўсёды, устала на досвітку, па сцежачцы з даёнкай рушыла да хлява, да сваёй кароўкі і... стала. Душа ў пяткі зайшла — з іхняга вішняку нехта на карачках паўзе, пытаецца:

— Цётачка, а якая гэта «дзярэўня»?

Родную маці сын не пазнаў!

Зрэшты, маці ў першы момант таксама. Потым падняла небараку з зямлі, завяла ў хату, палажыла спаць...

І ціха ж, як быццам! Але не паспела выгнаць карову, як вёска ўжо гудзела. Людзі наперабой расказвалі адно аднаму пра «цётачку», пра вішанькі і «дзярэўню». «Маладзец, Алёша, — гаварылі пра хлопца мужчыны. — Правільна напрамак трымаў — праз вішанькі, да роднай хаты».

Пазней даведаліся, што па дарозе хлопец сустрэў свайго аднакласніка, і яны, як гэта водзіцца, выпілі — адзначылі Аляксееў дэмбель. Пасля чаго адзін заснуў у ельніку, а другі — каля хаты ў вішаньках.

Што цікава, рэпутацыю хлапца гэта ніколькі не падарвала. Проста людзі, сустракаючы яго — нават праз гады — міжволі ўспаміналі вяртанне з войска і ўсміхаліся.

Ірына Салата,

Гродна.

АД ЖОНКІ НІЧОГА НЕ СХАВАЕШ

Наш Міхась — хлопец добры, працавіты, вясёлы. Сам вясковы, але ажаніўся з мінчанкай: прыязджала яго Алачка на лета да цёткі ў суседнюю хату, так і пазнаёміліся. Сваякі дзяўчыны не надта хацелі таго вяселля, бо яна ўніверсітэт заканчвала, а жаніх у школе быў двоечнік, пасля арміі працаваў у калгасе. Але ж — каханне...

Так што Міхась ужо гадоў трыццаць як сталічны жыхар, працуе то на будоўлі, то на рамонце машын. А жонка і сын у яго — «інтэлігенты» (так ён іх называе — ці то здзекліва, ці то паблажліва) — абодва праграмісты.

Але ж і родную вёску Міхась не забывае, хоць бацькі ягоныя даўно памерлі. Кожныя выхадныя ўлетку тут і ў адпачынак прыязджае. Ала яго таксама з ім. Можа, не надта і хоча, але ёсць у мужа адна загана: як толькі ў вёсцы з'явіцца — сабутэльнікі тут як тут. А ён ахвочы кампанію падтрымаць. Жонка тых хаўруснікаў далей за брамкі не пускае, а вось калі раптам Міхась адзін апынецца... Карацей, гісторыя многім знаёмая.

Дык вось аднойчы ў бацькоўскую хату прыехаў Міхась без сваёй палавіны і нават без цешчы (бо, калі што, Ала сваю маці з ім адпраўляла). Жонка строга наказала: глядзі, не пі, бо я ўсё роўна дазнаюся! Наказ наказам, але ж пад вокнамі прыяцелі стаяць!

Гудзелі цэлы дзень, а пад вечар, выправіўшы гасцей, стомлены гаспадар улёгся на канапу перад тэлевізарам. У той час толькі адключылі аналагавае тэлебачанне і не ўсе вяскоўцы яшчэ паспелі купіць прыстаўкі ці новыя экраны, а ў Міхася ўжо ўсё ў парадку было — прывёз з Мінска новую прыстаўку, падключыў, наладзіў — глядзі не хачу. Вось і ляжаў на канапе, каналы пераключаў, пакуль сон пад нейкі канцэрт не змарыў...

Прачнуўся гадзіны ў тры ночы. Галава баліць, смага душыць, у хаце — хоць вока выкалі... Толькі тэлевізар у куце свеціцца... Прычым неяк дзіўна — экран чорны, а пасярэдзіне — круглае блакітнае вочка і нешта дробна-дробна (здалёк ды сп'яна і не відаць) пад ім напісана.

І тут да Міхася дайшло! Нездарма ж Алка пагражала, што пра ўсё даведаецца. Праграмісты чортавы! Праз тэлевізар за мной сачыць уздумалі!

Схапіў Міхась мабільны — давай жонцы званіць, выказваць усё, што пра іх, «інтэлігентаў», думае.

А тая спачатку ды спрасонку не зразумела, што ён хоча ад яе ў тры ночы, а зразумеўшы, спалохалася: дапіўся мужык да белай гарачкі!

Раніцай, як толькі развіднела, яна прымчала на машыне ў вёску.

1903 год — нарадзіўся (вёска Лабковічы, цяпер у Крычаўскім раёне) Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, дзяржаўны дзеяч БССР. З 1937 года — наркам аховы здароўя рэспублікі, старшыня СНК, у пасляваенны час — намеснік старшыні Савета Народных Камісараў і міністр замежных спраў БССР. У 1966—1977-м — саветнік Савета Міністраў Беларусі. Памёр у 1977 годзе.

1924 год — у Мінску на базе Мінскіх пяхотных курсаў створана Аб'яднаная Беларуская ваенная школа імя ЦВК БССР, якая рыхтавала кадры камандзіраў тэрытарыяльных і кадравых беларускіх войскаў і для фарміравання Чырвонай Арміі (існавала да сакавіка 1937 года).

1933 год — нарадзіўся (вёска Варакомшчына, цяпер у Дзятлаўскім раёне) Вячаслаў Адамчык, пісьменнік, перакладчык і драматург. Аўтар раманаў «Чужая бацькаўшчына» (быў экранізаваны студыяй «Беларусьфільм»), «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца» і іншых твораў. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа, Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа. Памёр у 2001 годзе.

2002 год — прайшла ўрачыстая цырымонія закладкі і пачатку будаўніцтва новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У свеце

1512 год — Мікеланджэла Буанароці завяршыў размалёўку скляпення Сікстынскай капэлы — аднаго з найважнейшых парадных залаў Ватыкана.



1905 год — быў апублікаваны царскі ўказ «Аб мерах да ўмацавання адзінства ў дзейнасці вышэйшых органаў улады». Старшынёй Савета Міністраў Расійскай імперыі быў прызначаны граф С. Ю. Вітэ.

1939 год — нечарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла закон аб уключэнні Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР і ўз'яднанні іх з УССР і БССР.

1990 год — у адпаведнасці з указам Прэзідэнта СССР М. С. Гарбачова ў СССР быў уведзены камерцыйны курс рубля да замежных валют.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.09	17.37	9.28
Віцебск —	8.02	17.22	9.20
Магілёў —	7.59	17.27	9.28
Гомель —	7.52	17.28	9.36
Гродна —	8.23	17.52	9.29
Брэст —	8.19	17.57	9.38

Месяц

Маладзік
28 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Клеапатры, Івана, Сяргея.*
К. *УСІХ СВЯТЫХ.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Аб'ява ў музеі: «Прыносіць з сабой і разглядаць карціны і скульптуры строга забараняецца!»

Два галоўныя пытанні любому ўрачу:
1) Я буду жыць?
2) А піць можна?

Неяк мяне стрыг трохі п'янаваты цырульнік. Я назваў прычоску «паўбокс пад паўсалодкім».

На спектаклі:
— Чаму такая дзіўная трактоўка знакамітай п'есы: Дэздэмона душыць Атэла?!
— Што зробіш, мы за раўнапраўе палоў.

Рамонкавы чай супакойвае толькі ў адным выпадку: калі выплюхнуць яго каму-небудзь у твар.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3872.

Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

1 лістапада 2019 г. № 44 (529)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

НЕ ЎПАДЗІ!

Чаму дрэвы становяцца небяспечныя для чалавека і як мінімізаваць гэту пагрозу?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Халодныя і моцныя вятры, што ўсё часцей праяўляюць сябе ў восеньскі час, здаецца, выпрабоўваюць сілы паніклых дрэў, якія ўжо скінулі лістоту. Некаторыя з іх не вытрымліваюць гэтага спаборніцтва са стыхіяй і з грукатам падаюць на зямлю... ці на прыпаркаваны побач аўтамабіль.

стар. 4

ВЫБАРЫ-2019

НЮАНСЫ ВЫБАРУ СЕНАТАРАЎ

Фота БелТА.

Вынікі выбараў у Савет Рэспублікі ЦВК падвядзе 12 лістапада. Гаворка пра гэта ішла на пасяджэнні Цэнтральнага выбарчага камітэта, перадае БелТА.

Выбары членаў Савета Рэспублікі адрозніваюцца ад выбараў у Палату прадстаўнікоў тым, што з'яўляюцца ўскоснымі. Членаў верхняй палаты выбіраюць дэпутаты мясцовых Саветаў. Пасяджэнні праходзяць галосна, на іх маюць права прысутнічаць СМІ.

У ЦВК растлумачылі нюансы працэдуры назірання. Яго могуць весці толькі члены Савета Рэспублікі, якія не балатуюцца на наступны тэрмін, а таксама не задзейнічаныя ў галасаванні дэпутаты мясцовых Саветаў, аблсаветаў. Што датычыцца прысутнасці назіральнікаў ад грамадскіх аб'яднанняў, то законам гэта не прадугледжана.

Міжнародных назіральнікаў таксама запрашаюць працаваць на выбарах у Палату прадстаўнікоў. Выбарчую кампанію ў Савет Рэспублікі яны не ахопліваюць.

Нагадаем, што выбары сенатараў прызначаныя на 7 лістапада.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Навацыі ў законах

Якія змены ў нарматыўных дакументах разгледзелі сенатары на мінулай сесіі Савета Рэспублікі і з якімі пагадзіліся?

стар. 2

Што трэба эканоміцы?

Разважае старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў.

стар. 3

«Праслыя» правады

Вялікія і прыгожыя ліпы, ясені, таполі, бярозы тояць небяспеку для вясковых сядзіб.

стар. 13

Зняважаная памяць

Два бакі адной і той жа праблемы: махлярства на памяці і непавага да памерлых продкаў.

стар. 14

Арэлевы парадокс



Чаму жыхары аднаго з мінскіх двароў, якія скардзіліся камунальнікам, што не хапае гульнявога абсталявання, адмовіліся ад яго ўстаноўкі.

стар. 16

СУПРАЦОЎНІЦТВА

КОЛА ІНТАРЭСАЎ

Беларусі і Кітая становіцца больш шырокім з кожным годам

Аб гэтым ішла гаворка падчас сустрэчы старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея Рахманава з дэлегацыяй Шанхайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая, якая прайшла ў Савеце Рэспублікі.

Адносіны паміж дзвюма краінамі развіваюцца вельмі інтэнсіўна і дынамічна, і гэта звязана не толькі з развіццём гандлёва-эканамічных стасункаў: мы аднолькава глядзім на праблемы, якія існуюць сёння ў свеце. Сітуацыя змяняецца, многія праблемы, звязаныя з канфліктамі, бяспекай, трэба вырашаць разам, лічыць Сяргей Рахманаў. І нягледзячы на розніцу ў памерах дзвюх дзяржаў, кожная з'яўляецца лідарам: Кітай — у свеце, Беларусь — у сваім рэгіёне. Менавіта наша краіна стала свайго роду жамчужынай на шляху рэалізацыі глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс. Адзін шлях». Таму разам з палітычным дыялогам трэба ўмацоўваць тэхналагічнае супрацоўніцтва, упэўнены сенатар.

Сёння Кітай дэманструе пад'ём па вядучых перадавых тэхналогіях, Беларусь таксама мае сур'ёзныя напрацоўкі па розных кірунках (у ІТ-сферы, прыборабудаванні, вытворчасці мінеральных угнаенняў і іншых) і мае шмат прапаноў для сумеснай рэалізацыі.

Кіраўнік дэлегацыі, намеснік старшыні Шанхайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая Сюй Ібо выказаў згоду з салідарным пунктам погляду на многія праблемы. «Самае галоўнае ў палітычным аспекце тое, што мы аднолькава глядзім на глабальныя праблемы, — упэўнены ён. — Усебаковае стратэгічнае партнёрства з кожным днём напаўняецца ў больш практычным сэнсе. І калі паглядзець у гістарычнай рэтраспектыве, сёння мы знаходзімся ў найлепшым перыядзе нашых адносін».

Кіраўнік дэлегацыі падкрэсліў, што Беларусь стала адной з першых краін, якія падтрымалі рэалізацыю глабальнай ініцыятывы Кітая «Адзін пояс. Адзін шлях».

— Для нас важна, каб яе рэалізацыя насычалася рознабаковымі праектамі, якія былі б карысныя для ўсіх краін-удзельніц, — падкрэсліў Сюй Ібо.

Ён пагадзіўся, што нашым краінам неабходна ў далейшым развіваць адносіны не толькі ў сферы палітыкі і эканомікі, але і паглыбляць сувязі і больш актыўна супрацоўнічаць па розных кірунках: ад ІТ да турызму і культуры.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ПУНКТЫ РОСТУ

Беларусь зацікаўлена ўдзельнічаць у інфраструктурных праектах Бангладэш

Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Бангладэш Міхаіл МЯСНІКОВІЧ правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Народнай Рэспублікі Бангладэш у Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Сайфулам Хокам, які завяршае дыпламатычную місію ў Беларусі.

Фота БелТА.

Краіны маюць добрыя перспектывы для пашырэння супрацоўніцтва, адзначыў Міхаіл Мясніковіч. «Нам неабходна ў большай ступені сканцэнтраваць увагу на інфраструктурных аб'ектах. Гэта праекты ў галіне транспарту, у тым ліку чыгуначнага, і электраэнергетыкі», — прыводзіць яго словы прэс-служба верхняй палаты парламента.

Бангладэш рэалізуе буйны праект па будаўніцтве ўласнай атамнай электрастанцыі. Работы вядуцца з прыцягненнем беларускіх спецыялістаў. Тут таксама ёсць рэзервы для развіцця партнёрства, дадаў старшыня Савета Рэспублікі.

Ён таксама звярнуў увагу на станоўчую дынаміку развіцця беларускага экспарту ў гэтую краіну. «Калі казаць пра задачы, якія нам удалося вырашыць, то перш за ўсё трэба сказаць аб тым, што наладжаны экспарт беларускай тэхнікі ў Бангладэш: мы ўжо маем кантракты на 50 мільёнаў долараў, амаль падрыхтаваныя дакументы яшчэ на 17 мільёнаў. Акрамя таго, у рабоце знаходзяцца новыя экспартныя кантракты амаль на 100 мільёнаў долараў ЗША», — удакладніў Міхаіл Мясніковіч. Пры гэтым створаны беларускія сэрвісныя цэнтры ў Бангладэш, працуе фінансавая сістэма падтрымкі беларускага экспарту. На ўстойлівай аснове ў гэтую краіну ажыццяўляюцца экспартныя пастаўкі беларускіх калійных угнаенняў.

Адначасова расце і імпарт з Бангладэш. «Мы гатовыя імпартаваць яшчэ больш, больш актыўна працаваць па такіх таварных пазіцыях, як скураныя вырабы і загатоўкі, тавары для дывановай прамысловасці», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

У цэлым ён падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Бангладэш склаліся добрыя і даверныя адносіны, дынамічна развіваюцца палітычныя, эканамічныя і гуманітарныя сувязі. Падчас перагавораў разгледжаны пытанні супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы адукацыі і навукі. Размова таксама ішла аб падрыхтоўцы візіту ў Беларусь Прэзідэнта Бангладэш, які запланаваны налета.

Амбасадар падзякаваў Міхаілу Мясніковічу за прапановы і ініцыятывы і выказаў упэўненасць у далейшым умацаванні двухбаковых адносін паміж краінамі. Ён таксама пазначыў перспектыўныя кірункі ўзаемадзеяння ў агрампрамысловым комплексе, сярод якіх — механізацыя сельскай гаспадаркі, селекцыя і іншыя.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

ЖЫЦЦЁ ДЫКТУЕ ЗМЕНЫ

Больш за 20 пытанняў разгледзелі члены Савета Рэспублікі на пасяджэнні сёмай сесіі

У цэнтры ўвагі сенатараў былі змены ў законы «Аб пажарнай бяспецы», «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі», «Аб натуральных манаполіях», «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія зведалі радыяцыйнае забруджванне ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», «Аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў» і іншыя.

Спектр магчымасцяў урача агульнай практыкі пашырыцца

Аб асноўных зменах у Закон «Аб аказанні псіхіятрычнай дапамогі», якія прапануецца ўнесці, расказаў **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК**. Па яго словах, сярод навел ёсць як істотныя, так і тыя, што носяць тэхнічны характар. Засяродзім увагу на галоўных.

Асноўнай навацыяй трэба лічыць тое, што ўрачы агульнай практыкі атрымаюць права аказваць дапамогу пацыентам, у якіх пры аказанні першаснай медыцынскай дапамогі дыягнастуюцца прыкметы псіхічных расстройстваў. Гаворка ідзе пра захворванні, якія не пагражаюць іх жыццю і здароўю, а таксама іншым людзям і не патрабуюць накіравання пацыента да псіхіятра. Чаму гэтая функцыя перадаецца на ўзровень лекара, што большай часткай вядзе звычайны тэрапеўтычны прыём?

— Да 2020 года доля ўрачоў, якія працуюць па прынцыпе «ўрач агульнай практыкі», у агульнай колькасці ўрачоў у сістэме аказання першаснай медыцынскай дапамогі дасягне 100 %. Яны аказваюць дапамогу не толькі ў галіне тэрапіі, але і ў іншых спецыялізаваных галінах медыцыны, — патлумачыў міністр аховы здароўя.

Па яго словах, цяпер дастаткова востры з'яўляецца праблема магчымасці аказання ўрачамі агульнай практыкі медыцынскай дапамогі пацыентам з лёгкімі формамі псіхічных і паводзінскіх расстройстваў. У большасці сваёй гэтыя людзі адмаўляюцца ад кансультацыі ўрача-псіхіятра праз нейкія забабоны, але гатовыя атрымліваць дапамогу ад урача агульнай практыкі. Дарэчы, такі падыход практыкуецца ў многіх краінах.

Цікава, зыходзячы з якіх падстаў будзе вызначацца, што трэба такому пацыенту? Уладзімір Каранік кажа, што медыцынская дапамога будзе аказвацца ўрачамі агульнай практыкі на аснове адпаведнага медыцынскага пратакола, праект якога ўжо распрацаваны.

Істотнымі можна лічыць і прапанаваныя змяненні ў вызначэннях тэрмінаў «пацыент» і «ўрач-спецыяліст у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі».

Так, напрыклад, у папярэднім вызначэнні ў дачыненні да пацыента «дзеянні, што даюць падставы меркаваць пра наяўнасць у яго псіхічнага расстройства» дадаецца «і бяздзеянні». Як растлумачыў міністр, псіхічныя расстройствы ў шэрагу выпадкаў праяўляюцца не актыўнымі дзеяннямі, а бяздзеяннем або пасіўнымі паводзінамі, якія могуць прыводзіць да негатыўных наступстваў.



Што датычыцца тэрміналогіі ў дачыненні да ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі, то з яе выключаецца «ўрач-сексолаг». Чаму? Таму што згодна з Міжнароднай класіфікацыяй хвароб і іх пераглядам, летась прынятым Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, парушэнні сексуальнай сферы не адносяцца да псіхічных расстройстваў.

Навацыі закранулі і іншыя аспекты, звязаныя, напрыклад, з транспарціроўкай пры аказанні тэрміновай псіхіятрычнай дапамогі, высновамі ўрачэбнай кансультатыўнай камісіі аб неабходнасці правядзення прымусовага псіхіятрычнага агляду і гэтак далей.

Цэны — больш празрыстыя?

Змены ў Закон «Аб натуральных манаполіях» прадставіў **міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір КАЛТОВІЧ**. Дарэчы, дакумент дзейнічае з 2002 года, а апошнія канцэптуальныя змены ў яго ўносіліся ў чэрвені 2014-га. Прапанаваныя навелы, паводле слоў міністра, павысяць эфектыўнасць кантролю і рэгулявання натуральных манаполій. Што за яны? Будуць зменены пералікі сфер натуральных манаполій, што паўплывае на развіццё канкурэнтнага асяродку. Так, замест адной сферы па перадачы і размеркаванні электрычнай энергіі павінны з'явіцца тры больш дробныя: па перадачы, размеркаванні і аператыўна-дыспетчарскім кіраванні. Будуць выключаны з натуральных манаполій паслугі электрасувязі агульнага карыстання і паслугі паштовай сувязі, таму што за апошнія гады было выдадзена больш за 20 ліцэнзій на гэтыя віды дзейнасці. Новыя гульцы, адпаведна, паўплывалі на стварэнне новага сегмента рынку.

Акрамя таго, законапраектам уводзіцца інстытут публічных слуханняў пры ўстанаўленні тарыфаў на паслугі натуральных манаполій, метадалогія і правілы карыстання імі. Таксама прадугледжваецца комплекс нормаў па павышэнні празрыстасці рэгулявання натуральных манаполій: суб'екты павінны будуць размяшчаць у адкрытым доступе пералік і інфармацыю аб сваёй дзейнасці: цэны, тарыфы, парадак іх змяненняў, умовы заключэння дагавораў на аказанне паслуг, структуру затрат, вынікі сваёй дзейнасці і гэтак далей. Усё гэта, на думку распрацоўшчыкаў, станоўча паўплывае на развіццё канкурэнтнага асяродку.

Трэба сказаць, што прыведзеныя змены ў законы былі падтрыманы членамі Савета Рэспублікі. Ратыфікаваны таксама шэраг міжнародных дагавораў і пагадненняў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ЭКАНОМІЦЫ ПАТРЭБНЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ

Размова з сенатарам аб заканадаўчай базе для бізнесу

Шостае скліканне вышэйшага заканадаўчага органа нашай краіны завяршае работу. 7 лістапада — выбары ў новы склад верхняй палаты парламента, 17 лістапада — у склад ніжняй. І калі першыя скліканні вышэйшага заканадаўчага органа краіны фарміравалі базавае нацыянальнае заканадаўства, наступныя — удасканальвалі яго і гарманізавалі з інтэграцыйнымі працэсамі, то ў пятым і шостым скліканнях парламентарыі стваралі ўмовы для далейшага развіцця эканомікі. Пра тое, наколькі гэта ўдалося, мы распыталі старшыню Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіміра ПАНЦЮХОВА.

ПОСПЕХ ВАЖНА РАЗВІЦЬ

— Уладзімір Іванавіч, у апошнія гады ў Беларусі прыняты сістэмныя меры па разняволенні прадпрымальніцтва і стымуляванні дзелавой актыўнасці. Як вы ацэньваеце іх эфектыўнасць? Ці мае патрэбу беларускі бізнес у далейшай падтрымцы дзяржавы?

— Калі я ўзначаліў камісію, беларускі бізнес быў на ўздыме. Напярэдадні новага 2011 года Прэзідэнт падпісаў Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь», якая паклала пачатак трываламу дыялогу паміж дзяржслужачымі і дзелавымі коламі.

На жаль, у 2014 годзе стала відавочна, што беларуская эканоміка, а разам з ёй і бізнес, жывуць ва ўмовах, якія не прадугледжаны ў існуючых прагнозах і праграмах, — на эканоміку негатыўна ўплывалі знешнія фактары. Каб захаваць дасягнутыя вынікі і забяспечыць далейшае развіццё малога і сярэдняга бізнесу, патрабаваліся нестандартныя меры. Кіраўнік дзяржавы на сустрэчы з прадстаўнікамі дзелавых колаў у снежні 2017 года абсалютна правільна адзначыў: «Малы і сярэдні бізнес — найважнейшы складнік устойлівага развіцця эканомікі Беларусі».

Савет Рэспублікі як палата прадстаўнікоў рэгіёнаў мае непасрэднае дачыненне да вырашэння гэтых пытанняў. Сенатары добра ведаюць сітуацыю на месцах, у курсе таго, якія пытанні найбольш хвалююць прадпрымальнікаў. Мы выйшлі на Адміністрацыю Прэзідэнта з канкрэтнымі прапановамі, многія з якіх былі ўлічаны. У 2018 і 2019 гадах Пастаянная камісія правяла два выязныя мерапрыемствы ў Віцебску і Баранавічах. Сустрэліся з прадстаўнікамі бізнесу, выслухалі іх пажаданні і накіравалі прапановы ў дзяржорганы. Спадзяёмся, што нас чарговы раз пачуюць.

Эканоміцы патрэбны новы рэсурс. І рэсурс гэты — у прадпрымальнікаў.

«ЛІЧБА» — НЕ ДАНІНА МОДЗЕ

— А яшчэ ў «лічбе»? Пра неабходнасць пераводу эканомікі ў «лічбу» кажуць шмат, але не ўсе разумеюць, пра што ідзе гаворка. Вы курыравалі на V Форуме рэгіёнаў у Магілёве секцыю, прысвечаную супрацоўніцтву рэгіёнаў у сферы лічбавай эканомікі. Што гэта азначае для абывацеля і для дзяржавы?

— Думаю, вы пагадзіцеся, што сёння свет уступіў у стадыю кардынальных эканамічных, грамадскіх, ваенна-палітычных і іншых змяненняў, якія характарызуюцца высокай інтэнсіўнасцю і дынамічнасцю. Перавод эканомікі ў «лічбу» — не проста модны трэнд, гэта пытанне нацыянальнай бяспекі і, калі хочаце, глабальнай канкурэнтаздольнасці. Ад гэтых працэсаў нельга заставацца ўбаку, інакш трапім у залежнасць ад сусветных лідараў лічбавізацыі. Мы павінны працаваць на апярэджанне.

Ужо сёння гэта патрабуе значных рэсурсаў — фінансавых, кадравых, тэхнічных. У адзіночку ажыццявіць паўнавартасны пераход да «лічбы» надзвычай цяжка, неабходна кааперавацца як у рамках Саюзнай дзяржавы, так і на прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза, а ў некаторых кірунках — Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Палітыкамі і эканамістамі абазначаны тры ключавыя кірункі для супрацоўніцтва. Па-першае, прыняцце сумесных мер у сферы інфармацыйнай бяспекі і распрацоўка агульных правіл бяспекі ў лічбавым асяроддзі. Па-другое, гарманізацыя заканадаўчай базы, у тым ліку стварэнне адзінай прававой прасторы ў сферы лічбавай эканомікі з уніфікацыяй падыходаў да рэгулявання абарачэння лічбавых актываў. І па-трэцяе, рэалізацыя сумесных лічбавых праектаў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, энергетыцы.

Дэкрэт кіраўніка дзяржавы № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі», як і рашэнне аб стварэнні HiTech-універсітэта, — гэта стратэгічныя рашэнні. Але яны — толькі пачатак шляху, які мы павінны прайсці годна.

СКЛАДАНАЯ РОЛЯ ПАДАТКАЎ

— У Савеце Рэспублікі актыўна вялася работа над новай рэдакцыяй Падатковага кодэкса. Як унесеныя змены працуюць на практыцы?

— Аб'ём Падатковага кодэкса перавышае 1000 старонак. Ён напісаны, перш за ўсё, зразумелай мовай для тых, хто выкарыстоўвае яго ў паўсядзённай рабоце — для падатковых работнікаў і бухгалтараў.

Змены і дапаўненні ў гэты дакумент уносіліся штогод. Аднак у канцы 2017 года кіраўніком дзяржавы было даручана падрыхтаваць новую рэдакцыю. Галоўнае патрабаванне: падатковая сістэма павінна быць празрыстая, простая і зразумелая для людзей і бізнесу. Неабходна было прыняць меры па паляпшэнні падатковага адміністравання, спрашчэнні парадку вылічэння і выплаты падаткаў, зніжэнні падатковай нагрузкі.

Парламентарыі і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі актыўна працавалі над Падатковым кодэксам, уваходзілі ў склад рабочых груп: міжведамаснай, пры Міністэрстве фінансаў і пры Савеце Міністраў.

Падатковы кодэкс разглядаўся і абмяркоўваўся паартыкульна. У новай рэдакцыі ўлічаны многія ініцыятывы Савета Рэспублікі, накіраваныя на развіццё прадпрымальніцтва і скарачэнне падатковага цяжару для суб'ектаў гаспадарання; пашырэнне магчымасці прымянення інвестыцыйнага выліку па падатку на прыбытак; зніжэнне ставак падатку на прыбытак і падаходнага падатку з фізічных асоб у дачыненні дывідэндаў у выпадку рэінвеставання ў развіццё вытворчасці і іншае.

У выніку сумеснай работы быў падрыхтаваны выніковы дакумент, палажэнні якога прадугледжваюць кампрамісныя рашэнні, улічваюць інтарэсы і падаткаплацельшчыкаў, і бюджэту.

— Ці апраўдала новая рэдакцыя Падатковага кодэкса чаканні бізнес-супольнасці?

— Практычная рэалізацыя палажэнняў новай рэдакцыі Падатковага кодэкса абмяркоўвалася сёлета 13 верасня ў Магілёве на пашыраным пасяджэнні прэзідыума навукова-кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі. У ім удзельнічалі не толькі сенатары, але і дэпутаты ніжняй палаты, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага, мясцовага кіравання і самакіравання, бізнес-супольнасці, дзяржаўных прадпрыемстваў.

Усе пагадзіліся, што адаптацыйны перыяд з азнаямленнем і прымяненнем нормаў новай рэдакцыі Падатковага кодэкса прайшоў «бязбольна». Дакумент стварае дадатковыя ўмовы для эканамічнага развіцця. Не парушаная фінансавая стабільнасць бюджэту і арганізацый. Кодэкс прыняты своечасова. Цяпер напрацоўваецца правапрымяняльная практыка.

ТВОР НЕЗВЫЧАЙНАГА ЖАНРУ

— Над якімі яшчэ ключавымі законапраектамі працавала Пастаянная камісія, якую вы ўзначальваеце?

— За гэтыя гады мне давялося ўдзельнічаць у прыняцці больш чым ста законаў, пераважная большасць з якіх датычылася ўдасканалення эканамічных адносін, рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў, падатковага рэгулявання, развіцця прадпрымальніцтва і іншых формаў гаспадарання. Шмат увагі ўдзялялася пытанням інвестыцыйнай дзейнасці, занятасці, экспарту, інфарматызацыі эканомікі. Праз нашы рукі прайшлі законы «Аб рынку каштоўных папер», «Аб гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб», аб штогадовых рэспубліканскіх бюджэтах, пра змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб банкруцтве».

Прынятыя новыя рэдакцыі законаў «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)», «Аб аўдытарскай дзейнасці» і многіх іншых. І кожны раз, займаючыся падрыхтоўкай заканадаўчага акта, мы стараліся зверыць свае погляды на праблему з думкай выбаршчыкаў.

Я не забываў і пра Магілёўшчыну, «прымяраючы» на яе законапраекты — будуць яны працаваць ці не будуць, дадуць рэгіёну, які прадстаўляю ў парламенце, развіццё і рух наперад ці не. Гэта дапамагала ў вызначэнні пазіцыі, давала ўпэўненасць у выбары.

Распрацоўка і прыняцце закона — складаная, карпатлівая праца. Любое змяненне заканадаўства — гэта маленькі твор незвычайнага жанру. Разглядаючы законапраект, даводзілася ўзважваць усе «за» і «супраць», дэталёва вывучаць нюансы і пралічваць наступствы, даведвацца думку вялікай колькасці спецыялістаў. Дамагчыся ў прававым акце гарманічнай абароны інтарэсаў усёй краіны і асобных рэгіёнаў, усяго грамадства і асобных груп людзей вельмі няпроста. Памылкі дорага абыходзяцца.

Няма сумненняў, што ў гэтым складзе мы прымем галоўны законапраект года — Бюджэт-2020. Мы шчыльна працуем з урадам над яго збалансаванасцю і рэалістычнасцю, над тым, каб ён адпавядаў магчымасцям дзяржавы, забяспечыў нармальнае функцыянаванне эканомікі, стаў падмуркам далейшага развіцця краіны. Але гэта тэма асобнага інтэрв'ю.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

СВАЯ СПРАВА

Малыя бізнесы для рэгіёнаў, людзей з асаблівасцямі і жанчын

На падтрымку эканамічнага развіцця на месцах у нашай краіне накіраваны ў тым ліку і праекты ПРААН. За апошнія тры гады арганізацыяй было падтрымана каля 40 малых бізнесаў у раёнах. Гэта палепшыла ўмовы прадпрымальніцтва для 30 тысяч мясцовых жыхароў. Перспектыўныя кірункі для сельскіх рэгіёнаў — экатурызм, захаванне культурнай спадчыны, сельская гаспадарка.

— Наша падтрымка не абмяжоўваецца грантамі, — кажа **Аляксей ЧЫСТАДАРСКІ, кіраўнік аддзела інфармацыі і прасоўвання ПРААН у Беларусі.** — Наш падыход базуецца на комплексным рашэнні — тэрытарыяльна-арыентаваным развіцці, падчас якога ствараюцца ўмовы не для аднаго прадпрыемства ці бізнесу, а для ўсёй суполкі, што пражывае на пэўнай тэрыторыі, шляхам наладжвання партнёрстваў паміж мясцовымі бізнесменамі, адміністрацыямі і жыхарамі. Таксама выяўляем моцныя і слабыя бакі кожнага рэгіёна.

Па словах спецыяліста, такі падыход дазваляе рэгіёну развівацца далей і пасля спынення фінансавых уліванняў. Нядаўна завяршыўся праект «Мясцовае развіццё», у межах якога работу атрымалі 143 чалавекі.

Ва ўсходняй частцы краіны створаны шэсць бізнес-цэнтраў, якія бясплатна арганізуюць кансультацыі і трэнінгі для мясцовых людзей, зацікаўленых ва ўласным бізнесе.

— Напачатку ў іх не хапае ведаў, рэсурсаў, яны баяцца рызыкі і няўпэўненыя ў сабе. Аднак пасля кансультацый 70 % грамадзян пачынаюць свой бізнес ці гатовыя зрабіць гэта ў найбліжэйшы час, — акрэсліў Аляксей Чыстадарскі. — Мы правялі 40 бясплатных навучальных курсаў, у якіх удзельнічала 1300 чалавек, 80 % з іх задумалася аб пашырэнні існуючага бізнесу ці стварэнні новага.

У межах ініцыятыў ПРААН арганізаваны навучальныя курсы па асновах сельскай гаспадаркі ў Бягомлі для маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Пасля інтэрната, такім чынам, у гэтых людзей ёсць усе навыкі і веды, каб знайсці сабе работу ў сельскагаспадарчым сектары: на дзяржпрадпрыемствах ці ў фермерскіх гаспадарках.

Зімой распачнецца новая серыя бясплатных семінараў для прасоўвання жаночага прадпрымальніцтва ў пяці гарадах: Мінску, Віцебску, Магілёве, Горках і Полацку. Гэтыя заняткі дазволяць жанчынам, якія зацікаўлены ў тым, каб пачаць свой бізнес, больш даведацца пра магчымасці і рызыкі, формы фінансавання бізнесу, франчайзінг і іншыя крытычна неабходныя для заняткаў прадпрымальніцтвам рэчы.

Ірына СІДАРОК.

НЕ ЎПАДЗІ!

ЧАМУ ПАДАЮЦЬ ДРЭВЫ?

Аслабленне дрэў у гарадах адбываецца па розных прычынах, адзначае **кіраўнік сектара маніторынгу раслінnага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Аляксандр СУДНІК.** Гэта могуць быць: тэхнагеннае забруджванне навакольнага асяроддзя ад стацыянарных і перасоўных крыніц (напрыклад, ад выкарыстання супрацьгалалёдных рэагентаў на аснове NaCl); пагаршэнне ўмоў росту (анамальныя цеплавыя палі, асфальтабетоннае пакрыццё вуліц і тратуараў, вырошчванне дрэў у малагабарытных лунках); невыкананне патрабаванняў догляду за зялёнымі насаджэннямі; няправільны падбор устойлівых да забруджвання відаў і іншае. Пад уплывам гэтых і іншых фактараў дрэвы могуць стаць небяспечнымі.

— Згодна з Законам «Аб раслінным свеце», небяспечнымі называюцца дрэвы, што ствараюць сваім імаверным падзеннем пагрозу прычынення шкоды жыццю і здароўю грамадзян, маёмасці грамадзян і юрыдычных асоб, — расказвае **вядучы інжынер па ахове навакольнага асяроддзя УП «Зелянбуд Першамайскага раёна горада Мінска» Яўгенія БАЦЯНОЎСКАЯ.** — Да іх адносяцца сухастойныя дрэвы; дрэвы, пашкоджаныя стваловай гніллю ці якія маюць іншыя значныя пашкоджанні ствала і (ці) каранёвай сістэмы; дрэвы, што завіслі на іншых дрэвах, а таксама нахіленыя ўбок да будынкаў, калі радыус іх магчымага падзення перавышае бяспечную адлегласць да такіх аб'ектаў.

ХТО АЦЭНЬВАЕ НЕБЯСПЕКУ

Вызначаць, небяспечнае дрэва ці не, і прымаць рашэнне аб яго выдаленні могуць упаўнаважаныя выканкамам юрыдычныя асобы ў галіне азелянення. Так, у Мінску стан дрэў вызначаюць Зелянбуды адміністрацыйных раёнаў, у іншых рэгіёнах — арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ці лясгасы.

— Небяспечнае дрэва вызначаецца вядучым інжынерам па ахове навакольнага асяроддзя, а таксама камісіяй, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, юрыдычнай асобы ў галіне азелянення, іншых зацікаўленых органаў і арганізацый, — адзначае Яўгенія Бацяноўская. — Толькі маючы заключэнне аб прызнанні дрэва небяспечным, можна выдаліць гэты аб'ект раслінnага свету.

Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Андрэя КУЗЬМІЧА,** гэты дакумент заўсёды павінен быць пры сабе ў той асобы, што займаецца выдаленнем. Важна таксама абазначыць месца, дзе праводзяцца адпаведныя работы, стужкай ці іншым чынам з указаннем кантактных даных арганізацыі, якая выдаляе дрэва.

Усе небяспечныя дрэвы адначасова выявіць і выдаліць немагчыма, упэўнены спецыялісты. Сёння ў нашай краіне, згодна з Законам «Аб раслінным свеце», землекарыстальнікі — уласнымі сіламі ці з дапамогай спецыялізаваных арганізацый — раз на пяць гадоў павінны праводзіць на сваёй тэрыторыі ўлік аб'ектаў раслінnага свету. Падчас такіх абследаванняў могуць выяўляцца і небяспечныя дрэвы.

МАЯ ТЭРЫТОРЫЯ — МАЕ ПРАВІЛЫ?

Што датычыцца грамадзян, участкі якіх выдзелены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі, то на іх палажэнні Закона «Аб раслінным свеце» і адпаведна неабходнасць атрымання дазволу на выдаленне драўнінна-хмызняковай раслінnасці не пашыраюцца.

— Выключэнне складае сітуацыя, калі на ўчастку да атрымання яго грамадзянінам раслі каштоўныя дрэвы і выканкам зафіксаваў у дакументах неабходнасць іх захаваць, — тлумачыць Андрэй Кузьміч. — Каб выдаліць такія расліны, трэба звяртацца ў той орган, які ўстанавіў абмежаванні. Ва ўсіх астатніх выпадках грамадзянам нішто не замінае саджаць, перасаджваць, выдаляць дрэвы на сваім участку — як самім, так і з дапамогай прафесіяналаў.

Пры гэтым гаворка ідзе пра тэрыторыю толькі ў межах зямельнага ўчастка. Часта грамадзяне саджаюць дрэвы за яго межамі, напрыклад, паміж участкам і дарогай. Але самавольна гэтым займацца не варта, упэўнены Андрэй Кузьміч. Дрэвы, высаджаныя за межамі ўчасткаў, адносяцца да тэрыторыі агульнага карыстання і разглядаюцца не як уласнасць грамадзяніна. Калі ў месцы іх пасадкі былі раней праведзеныя камунікацыі, то пры правядзенні, напрыклад, рамонтных работ гэтыя дрэвы давядзецца выдаліць. Каб пазбегнуць такіх выпадкаў, лепш загадзя пацікавіцца ў сельвыканкаме, ці можна пасадзіць дрэва ў тым ці іншым месцы за межамі ўчастка. Што датычыцца пасадак дрэў і кустоў на прыдамавых тэрыторыях шматкватэрных дамоў, то з

тых жа прычын яны павінны праводзіцца арганізавана.

ЦІ МОЖНА САМАСТОЙНА ВЫДАЛЯЦЬ ДРЭВЫ, ШТО РАСТУЦЬ НА МОГІЛКАХ?

Гэтае пытанне вырашаецца згодна з заканадаўствам аб пахаванні і пахавальнай справе. Так, за арганізацыю работ па ўтрыманні і добраўпарадкаванні месцаў пахавання адказваюць мясцовыя органы ўлады. А непасрэдна за парадкам на могілках сочаць спецыялізаваныя арганізацыі, юрыдычныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі, вызначаныя выканкамамі. Яны ў тым ліку выконваюць работы па азеляненні месцаў пахавання і догляду зялёных насаджэнняў агульнага карыстання. Таму для выдалення небяспечных дрэў ці іншай раслінnасці па-за агароджамі лепш звяртацца да іх, пры гэтым спецыяльнага дазволу для такіх аперацый атрымліваць не трэба.

Згодна з Правіламі ўтрымання і добраўпарадкавання месцаў пахавання, асобы, якія ўзялі на сябе арганізацыю пахавання (гэта могуць быць, напрыклад, сваякі памерлага), выконваюць работы па выдаленні аб'ектаў раслінnага свету з участкаў для захавання праходаў паміж імі. Але перад выкананнем работ, асабліва з дрэвамі, якія пры выдаленні могуць пашкодзіць надмагіллі ці ствараюць пагрозу для самога чалавека, спецыялісты раяць узгадняць свае дзеянні з мясцовымі органамі ўлады, на балансе якіх знаходзяцца могілкі.

АД ШТРАФУ ДА ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

За незаконнае выдаленне аб'ектаў раслінnага свету прадугледжваецца як адміністрацыйная, так і крымінальная адказнасць.

Так, згодна з артыкулам 15.22 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, за незаконныя выдаленне, выманне, перасадку драўнінна-хмызняковай раслінnасці, што расце за межамі населеных пунктаў і не ўваходзіць у склад ляснога фонду, яе пашкоджанне ці знішчэнне фізічная асоба можа атрымаць штраф у памеры да 20 базавых велічынь (БВ), а за выдаленне, перасадку такой раслінnасці ў населеных пунктах — у памеры да 50 БВ.

За падобныя дзеянні, што нанеслі шкоду ў буйным памеры, надыходзіць крымінальная адказнасць (артыкул 277 Крымінальнага кодэкса).

— Пры гэтым трэба ведаць, што склас ці пратакол за такія адміністрацыйныя правапарушэнні маюць права не толькі мясцовыя органы ўлады, тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды, але і арганізацыі, што ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (ці) аказваюць камунальныя паслугі, — адзначае Андрэй Кузьміч.

ЯК ВЫРАТАВАЦЬ ДРЭВЫ?

Перш чым выдаліць небяспечнае дрэва, неабходна паспрабаваць яго захаваць, упэўнена Яўгенія Бацяноўская. Для гэтага прымаюцца ўсе неабходныя меры ў залежнасці ад стану расліны. Так, пашкоджанае стваловай гніллю дрэва ўжо не выратуеш, яго неабходна выдаляць. Звычайна спецыялісты хутка развітваюцца і з сухастоем. Але калі на дрэве застаюцца жывыя галінкі, выразаюць суш, і яно атрымлівае шанц на ажыўленне.

— Калі дрэва небяспечнае з-за ўхілу ці кроны, праводзіцца санітарная ці амаладжальная абрэзка, — расказвае Яўгенія Віктараўна. — Таксама ўлічваюцца ўзрост дрэва і тэрыторыя, дзе яно расце. Калі гэта ажыўленае месца, то, вядома, пакідаць яго небяспечна. Калі ж гэта парк ці паляна, то мы даём яму максімум жыцця. Таму што нават у самым скрыўленым дрэве можна ўбачыць прыгажосць.

Вераніка КОЛАСАВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У ТЭМУ

Не аварыйныя, а небяспечныя

Сярод змен, якія былі ўнесены ў 2016 годзе ў Закон «Аб раслінным свеце», адбылася замена паняцця «аварыйныя дрэвы» на «небяспечныя дрэвы».

— Падчас падрыхтоўкі праекта Закона было прааналізавана беларускае заканадаўства, і высветлілася, што паводле нормаў заканадаўства аб надзвычайных сітуацыях тэрмін «аварыя» мае значэнне пэўнай здзейсненай падзеі, прычым тэхнагеннага характару, — тлумачыць Андрэй Кузьміч. — У нашым жа выпадку аварыі пакуль не адбылося, пры гэтым існуе небяспека прыроднага характару. Таму і палічылі, што бліжэйшае да сутнасці пытання і таго стану, у якім знаходзяцца дрэвы, паняцце «небяспечныя дрэвы».

АДЭЛЯ ПРЫЗНАЧАЕ СУСТРЭЧУ

Канал «Культура» Беларускага радыё ў праграме «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» пачаў знаёміць маленькіх слухачоў з творам Наталлі Бучынскай «Незабыўныя сустрэчы з авечкай Адэляй».

Рубрыка «Чароўны куфэрак» існуе ў радыёклубе для дзяцей і падлеткаў шмат гадоў. За мінулы сезон слухачы пачулі тут беларускія народныя казкі, аповесці Паўла Міско «Прыгоды Бульбобаў» і «Як на нашы імяніны...», казкі Алены Масла «Як пані Чаротная ў Палангу на госці бегала» і «Пацучок Фелек», творы Наталлі Бучынскай «Атракцыёны для вадзянікоў», «Прыгоды маленькай машынкі», «Як бабры прытулак шукалі», аповесць Пятра Васючэнкі «Каляровая затока» і іншае.

— Сучасныя бацькі маюць два арыенціры — уласнае дзяцінства і рэкламу навінак. А што ж з кнігамі, якія выйшлі «паўпакалення» таму? Іх ужо няма ў кнігарнях, але дзеці, што іх чыталі, пакуль самі не сталі бацькамі. Такім чынам, наш «Чароўны куфэрак» вяртае ў поле зроку чытачоў цікавыя творы нашых аўтараў», — кажа кіраўнік праектаў Наталля Сіротка.



Аўдыяверсія казкі «Незабыўныя сустрэчы з авечкай Адэляй» прагучыць на хвалях канала «Культура» ў выкананні артысткі Лікі Пташук. «Гэта выдатны тэкст, лёгкі, выразны. Працаваць з ім — адно задавальненне. Я ўжо не ўпершыню сустракаюся з дзіцячымі творамі Наталлі Бучынскай і буду рада асабістаму знаёмству», — падзялілася ўражаннямі ад работы актрыса.

Кніга «Незабыўныя сустрэчы з авечкай Адэляй» убачыла свет у 2013 годзе. Пісьменніца зарэгістравала электронны адрас для сваёй гераіні, і цяпер авечка Адэля прымае лісты ад маленькіх чытачоў.

— Вобраз упартай, кемлівай і гламурнай авечкі Адэлі паўстаў перада мной так жыва, што аповеды пра яе прыгоды проста пацяклі ракой. Спрэчкі аўтара з гераіняй — авечкай, якая марыць стаць сусветна вядомай зоркай, — даюць дзецям адчуванне, быццам і яны таксама могуць паўдзельнічаць у развіцці гісторыі. Дарэчы, многія чытачы далучыліся да абмеркавання пытанняў, якія ім прапаноўвала Адэля на старонках часопіса «Бярозка». Іншыя дасылаюць на яе паштовую скрыню малюнкі. Ёсць і такія, якія лістуюцца з ёю, расказваюць пра сваіх сяброў, пра школу і сям'ю, пра хатніх гадаванцаў. Бывае, дзеляцца перажываннямі пра стасункі з блізкімі ці нават просяць парады. І Адэля ніколі не забывае адказваць сваім чытачам, — расказала пісьменніца Наталля Бучынская.

Дарэчы, у новым сезоне аб'ём літаратурна-драматычнага вяшчання для дзяцей на канале «Культура» пашырыўся. Рубрыка «Чароўны куфэрак» цяпер гучыць чатыры разы на тыдзень — з аўторка да пятніцы. А праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» выходзіць у 16.05 і паўтараецца зранку ў 10.05. І што важна, на сайце radiokultura.by захоўваюцца выпускі праграмы за апошні месяц, таму ўсе зацікаўленыя могуць паслухаць пачатак гісторыі.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 80

Сваю новую задачу прапануе нашым чытачам Мікалай Быкаў з Баранавіцкага раёна ***(гл. дыяграму)***.

Белыя: Крf1, Фg2, Лb1, Лg4, Сa7, Кd1, пе2 (7).

Чорныя: Крс4, Фс8, пп. d4, f4 (4).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

На Мемарыяле Чыгорына ў Пецярбургу (352 удзельнікі) Аляксей Аляксандраў падзяліў 1-3 месцы. Там жа ў бліцы (306 гульцоў) ён заняў 30-е месца, а Арцём Стрыбук — 40-е. Вось дзве пераможныя партыі беларускага гросмайстра ў «класічнай» праграме Мемарыяла.

Аляксей Аляксандраў — Яўген Забалотнаў. 1. c4 c5 2. Kf3 Kc6 3. Kc3 Kd4 4. e3 K:f3+ 5. Ф:f3 g6 6. a3 Cg7 7. b4 d6 8. Cb2 Kh6 9. h4 0-0 10. Фd1 Ce6 11. Ce2 cb 12. ab d5 13. cd C:d5 14. 0-0 Kf5 15. d4 C:g2 16. Кр:g2 e5 17. Лh1 ed 18. ed C:d4 19. Лa5 Лe8 20. Cc4 Фf6 21. Л:f5 gf 22. Kd5 Фe5 23. Ф:d4 Ф:d4 24. C:d4, 1:0.

Дзмітрый Цой — Аляксей Аляксандраў. 1. b4 e5 2. Cb2 C:b4 3. C:e5 Kf6 4. e3 0-0 5. Kf3 Лe8 6. Ce2 d5 7. 0-0 Kbd7 8. Cb2 Kb6 9. h3 Cd6 10. Фc1 c5 11.a4 Cd7 12. a5 Ka4 13. C:f6 Ф:f6 14. c3 c4 15. Kd4 Kc5 16. f4 Cf5 17. Ka3 Ce4 18. Kab5 Cb8 19. Фa3 Лc8 20. Kf3 h6 21. Kbd4 Cd6 22. Фc1 Лe8 23. h4 Фg6 24. Kph2 Лac8 25. Лg1 Фf6 26.g3 g6 27. Фf1 Крg7 28. Фh3 a6 29. Лaf1 Kb3 30. h5 K:a5 31. hg fg 32. g4 Kb3 33. Kf5+ Крf7 34. K:h6+ Крe7 35. Cd1 g5 36. K:g5 Ф:g5 37. Kf5+ C:f5 38. gf Фf6 39. Фh7+ Крd8 40. Лg7 Лc7 41. Лfg1 K:d2 42. Л:c7 C:c7 43. Лg7 Cd6 44. Крg2 Лe7 45. Фg8+ Крc7 46. Лg6 Фf7 47. f6 Ф:g8, 0:1.

* * *

У Алматы (36 удзельнікаў) Кірыл Ступак фінішаваў пятнаццатым. У Даўгаўпілсе (24 гульцы) беларускія шахматысты занялі восем з першых дзевяці радкоў турнірнай табліцы: 1. Юрый Ціханаў; 3. Аляксандр Сарбай; 4. Яраслаў Наумовіч; 5. Антон Безенсон; 6. Яўген Макараў і г. д. Дарэчы, на другім месцы апынуўся Дзмітрый Кананенка, які прадстаўляе Украіну, але жыве ў Оршы.

У чэмпіянаце свету сярод юнакоў і дзяўчат у індыйскім Мумбаі ўзялі ўдзел трое нашых суайчыннікаў: Варвара Палякова заняла 10-е месца сярод дзяўчынак да 14 гадоў, Вячаслаў Зарубіцкі — 13-е сярод юнакоў да 18 гадоў, а Ксенія Зелянцова была 37-я сярод дзяўчат да 18 гадоў.

На рэспубліканскім турніры ў Рагачове (28 удзельнікаў) прызавую тройку склалі Сяргей Вашчылаў, Міхаіл Спіжарны і Валянцін Ежаль.

Першынство Брэсцкай вобласці (33 удзельнікі) нечакана выйграў 13-гадовы Іван Кірпічоў з Пінска. На другім месцы — яго аднагодка, чэмпіёнка краіны сярод жанчын — Аляксандра Тарасенка (Брэст), на трэцім — Уладзіслаў Каташук (Брэст). У жаночым першынстве перамагла Арына Кузіч (Кобрын).

* * *

2-3 лістапада ў Мінску павінен прайсці XII Кубак «Альбіна» — традыцыйны міжнародны турнір па рашэнні шахматных кампазіцый, які мае статус аднаго з этапаў Кубка свету. Як і ў мінулыя гады, чакаецца ўдзел моцных рашальнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы. Падрабязней пра гэтае спаборніцтва — у наступным выпуску.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. g8K! Першыя правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Ігар Ананіч. На шэраг папярэдніх задач правільныя адказы даслаў Уладзімір Панько.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

КУЛІНАРЫЯ З АКЦЭНТАМ НА ЗДАРОЎЕ

З найбліжэйшай суботы, 2 лістапада, на «першай кнопцы» адбудзецца прэм'ера новага кулінарнага шоу. На «Кухні жыцця» навучаць гатаваць здаровую і карысную ежу не толькі гледачоў, але і вядомых спартсменаў, артыстаў і тэлевядучых.

Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.

«Кухня жыцця» — не толькі кулінарны праект, але і падручнік па культуры харчавання, эпіграфам да якога могуць стаць словы. «Мы — гэта тое, што мы ядзім». Такой думкі прытрымліваюцца і вядучыя праграмы Аляксандр Яраслаўцаў і Святлана Кашыцкая, якая з'яўляецца ўрачом-дыетолагам і фітнес-трэнерам і дапамагла прыйсці ў жаданую форму не адной славутасці.

Гасцямі на тэлевізійнай кухні стануць Вольга Барабаншчыкава, Аляксей Ягудзін, Ларыса Грыбалёва, Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Аляксей Талай і многія іншыя. Для іх вядучыя падабралі пытанні «на дэсерт», якія раскрыюць медыйных асоб з новага боку. У прэм'ерным выпуску праграмы адказваць на пытанні і гатаваць здаровую ежу будзе вядучы праектаў Белтэлерадыёкампаніі «Добрай раніцы, Беларусь!», «Макаёнка, 9» Яўген Перлін.

«Кухня жыцця» складаецца з цікавых рубрык — напрыклад, «Халадзільны рэвізор» раскажа, чым запоўніць лядоўню і з якімі прадуктамі лепш назаўсёды развітацца, «АБВГДэйка» пазнаёміць дзяцей з карыснымі ўласцівасцямі прадуктаў і падкажа, дзе і які вітамін шукаць. А вось «У чым фішка?» — спадарожнік кулінараў-аматараў у свеце лайфхакаў на кухні.

Таму не прапусціце прэм'ерны выпуск на «Беларусь 1» 2 лістапада ў 15.45.

Алена ДРАПКО.

Пяць пытанняў для вядучай «Кухні жыцця» Святланы Кашыцкай:

1. Здаровы лад жыцця пачынаецца... — З харчавання. Наш знешні выгляд, стан валасоў, скуры і любыя захворванні — усё гэта пачынаецца з харчавання.

2. Я ніколі не зайду на кухню... — Калі яна не прыбраная, бо люблю гатаваць у чысціні.

3. Мая любімая страва, што вяртае мяне ўспамінамі ў дзяцінства... — Макарона з сасіскай і бананы, якія мы куплялі некалі зялёнымі і клалі ў тумбачку, каб яны даспявалі. Магчыма, таму я цяпер люблю гатаваць пасту, бо ведаю, што такая страва дае больш карысці.

4. Пераку с, які парэкамендую... — Садавіна і арэхі. Я люблю, каб пераку с быў зручны. Таму і назвала арэхі — гэта найкарыснейшы прадукт для мозга і нервовай сістэмы. І садавіну, бо 90 працэнтаў людзей не спажывае патрэбную колькасць правільных вугляводаў і нават не здагадваецца пра тое, а ў выніку такога недахопу і з'яўляюцца лішнія кілаграмы.

5. Якой цаны не вартая ідэальная знешнасць? — Не трэба дзеля прыгажосці шкодзіць свайму здароўю. Бо жыць можна як заўгодна, але лепш, калі жывеш з энергіяй, з задавальненнем і якасна.

Свята ў найлепшых традыцыях

5 БЕЛАРУСЬ

Славутыя спартсмены і тэлевядучыя разыграюць чарговы «Кубак пятага канала»

— Па ўсіх пытаннях, якія датычацца электразабеспячэння сельскай мясцовасці, мы цесна супрацоўнічаем з мясцовымі ўладамі чатырох раёнаў. Гэта і абразанне крон высокіх дрэў, і выдаленне небяспечных дрэў, якія пагражаюць падзеннем на лініі электрапередачы. Нагадаю, для ліквідацыі аварыйнага дрэва абавязкова патрабуецца згода двух бакоў: сельсавета па арганізацыі работ і электрасетак. За намі стварэнне ўмоў для бяспечнага правядзення гэтых работ, — расказвае **галоўны інжынер «Маладзечанскіх электрычных сетак» Юрый РОГАЧ.**

Раней у сельскай мясцовасці для падводу электрычнасці да дамоў ужываліся неізаляваныя правады. Так было значна танней. Цяпер для падводу электрычнасці выкарыстоўваюцца толькі ізаляваныя правады або кабелі. Іх прымяненне значна павышае ўзровень бяспекі, ускладняе крадзеж электраэнергіі. Але гэта не значыць, што такі падыход і абразанне крон высокіх дрэў адразу вырашаюць праблему «праслых» правадоў. Аварыйнае дрэва лепш за ўсё па магчымасці спілаваць.

Старшыня Маладзечанскага райсавета Андрэй ПАЎКШТА сцвярджае, што на сесіях раённага Савета рэгулярна разглядаюцца пытанні добраўпарадкавання тэрыторый населеных пунктаў. Зразумела, закранаецца і праблема аварыйных дрэў.

— На іх ліквідацыю сельсаветам выдаткоўваюцца бюджэтныя сродкі. Але грошай, вядома, не хапае. Тады дэпутаты райсавета арганізоўваюць суботнікі, заклікаюць на дапамогу арганізацыі і сельгаспрадпрыемствы раёна. Агульнымі намаганнямі ўдаецца зрабіць больш, чым дазваляюць магчымасці бюджэту, — кажа суразмоўнік.

Дарэчы, па правілах на нізкавольтных паветраных лініях (да 400 вольт) неізаляваныя правады павінны быць на вышыні не менш за шэсць метраў, а ізаляваныя — не менш за пяць метраў ад зямлі, адлегласць да крон дрэў павінна складаць не менш за адзін метр. Далёка не ўсе вяскоўцы ведаюць гэта. **Дэпутат райсавета Віктар НЕВЯРОВІЧ** мяркуе, што сельскім саветам варта ўзмацніць тлумачальную работу на вёсцы, раскрываць небяспеку праслых у электралініі высокіх дрэў.

— Тут трэба ўлічваць і псіхалогію сталых людзей. Некалі яны, гаспадары вясковых сядзіб, пасадзілі побач з домам тонкія, у палец, пруткі. А цяпер гэта ўжо вялікія і прыгожыя ліпы, ясені, таполі, каштаны, бярозы. Шкада псаваць іх прывабную крону дзеля нейкіх там правадоў. І далёка не ўсе вяскоўцы ўсведамляюць, што гэта небяспечна для іх саміх, — кажа дэпутат.

Набліжэнне зімы звычайна суправаджаецца непагадзю, моцнымі вятрамі. І, як вынік, падзеннямі старых дрэў на дарогі, дахі жылых дамоў, прыпаркаваныя побач аўтамабілі, электралініі і гэтак далей. Акрамя таго, галінкі дрэў, якія сутыкаюцца з неізаляванымі правадамі ў дождж ці густы туман з расой, ператвараюцца ў своеасаблівы праваднік току. Адсюль і страты электраэнергіі (яна часткова «сыходзіць» у зямлю). Знаходжанне ў дождж каля такога дрэва нават пагражае жыццю чалавека. Між іншым, і ў сонечнае надвор'е таксама існуе схаваная пагроза: пры рэзкім дотыку сухой галінкі да неізаляванага провада ён можа заіскрыць і стаць прычынай запальвання, а затым нават і пажару, калі дах дома побач.

А ўвогуле з электрычным токам трэба быць заўсёды на «вы», бо ігнараванне патрабаванняў бяспекі прыводзіць да няшчасных выпадкаў. І прыкладаў гэтаму шмат.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Маладзечанскі раён.

МАТАЙ НА ВУС

ЗНЯВАЖАНАЯ ПАМЯЦЬ

Два бакі адной і той жа праблемы

Могілкі — наша агульнае месца смутку, і які там парадак, залежыць не столькі ад камунальнікаў і дэпутатаў, колькі ад нас. Дагледжанае асобна ўзятае пахаванне — прыклад для пераймання іншым. Цяпер стала модным рабіць прыгожыя афармленні, шыкоўныя помнікі, нават зоны са сталамі і лаўкамі, каб можна было пасядзець у цішыні, згадаць таго, каго ўжо няма на гэтым свеце. На памяці, як той казаў, не эканомяць. Галоўнае пры гэтым — не забыцца, што за вашай агароджай таксама чыясьці памяць. Павага да памерлых продкаў — гэта святое. Але, на жаль, чамусьці не для ўсіх.

Чорны бізнес

Асабіста ведаю чалавека, які, нягледзячы на вельмі паважаны ўзрост, амаль штогод прыязджае з Амерыкі ў маленькі раённы цэнтр, каб навесці на могілках сваіх бацькоў парадак. Самому яму гэта рабіць цяжка, і ён звяртаецца да тых, хто аказвае такія паслугі за грошы. Сёння іх нават у раёне, як у горадзе N з рамана Ільфа і Пятрова, колькі заўгодна. Вось амерыканец і звярнуўся ў адно такое бюро, аддаў грошы і спакойна паехаў у свае Штаты. Рытуальшчык спачатку абяцаў добраўпарадкаваць пахаванне восенню, цяпер адкладвае да вясны. Стары чалавек на тым канцы зямлі сабе месца не знаходзіць, шукае, як паўплываць на гэтага махляра. Пакуль, на жаль, безвынікова.

Такіх выпадкаў, як высветлілася, дастаткова. Апошнім часам стала больш нядбайных прадпрымальнікаў, якія бяруць грошы за добраўпарадкаванне месцаў пахаванняў, а потым знікаюць. Ці нешта робяць, але так, што ні сабе ні людзям. Дабіцца праўды бывае вельмі цяжка. Даводзіцца абіваць парогі юрыстаў, звяртацца ў суд, укладваць дадатковыя грошы.

У Магілёўскім гарадскім таварыстве па абароне спажыўцоў могуць расказаць шмат такіх гісторый. Прычым серыйных, накшталт вось гэтай. Адна магіляўчанка заказала афармленне пахавання ў прадпрымальніка-рытуальшчыка. Ён нешта рабіў, але пасля яго ўмяшання пахаванне стала выглядаць яшчэ горш, чым было да гэтага: аднекуль замест яшчэ нармальнага століка з'явіўся стары і ржавы, а лаўка наогул знікла. У судзе высветлілася, што прадпрымальнік добраўпарадкаваў могілкі сваіх кліентаў за конт іншых пахаванняў. Напрыклад, дзесьці знімаў агароджу і прывозіў на новы «аб'ект» — адным словам, перастаўляў могільнікавую маёмасць з аднаго месца на другое. Калі незадаволеных паслугамі рытуальшчыка стала шмат, ён закрыў свой гандлёвы пункт і перастаў адказваць на тэлефонныя званкі.

— Прэтэнзій да якасці работы прадпрымальнікаў, занятых у рытуальным сэрвісе, нямала, — адзначыла **старшыня Магілёўскай гарадской арганізацыі абароны спажыўцоў Вольга БАРАНАВА.** — Бывала, што фота чалавека на помніку атрымлівалася перавернутае або імя нябожчыка блыталі з імем заказчыка. Не рэдкасць, калі зацягваюць тэрміны выканання дагавора, мяняюць дызайн надмагілля, ненадзейна замацоўваюць элементы кампазіцыі. Здаралася, што чалавек заказваў помнік з мармуру, а яго выраблялі з больш таннага матэрыялу. Усіх выпадкаў нават адразу і не ўспомніш. Бывае, што за месяц звяртаецца болей за дзесяць чалавек. Прычым гісторыі такія, што становіцца страшна за людзей, якія так абыходзяцца з чужой памяццю. Мы ж таксама не вечныя.

А прыбраць за сабой?

А цяпер замалёўка з Глушанскага сельсавета Бабруйскага раёна. Не памылюся, калі скажу, што яна тыповая. У якасці пацярпелых выступаюць ужо не фізічныя асобы, а тыя, хто сочыць за парадкам на могілках.

— На нашай тэрыторыі восем гарадзянскіх могілак, — кажа **старшыня Глушанскага сельсавета Марыя СУШЧАНКА.** — Усе магілы на ўліку, у кожнага пахавання свой парадкавы нумар, зафіксаваны ў спецыяльнай праграме — лакальнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме органаў мясцовага кіравання і самакіравання пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню. Самая вялікая праблема, адпаведна, самая дарагая — знос аварыйных дрэў. Улічваючы, як хутка сохнуць могілкавыя бярозы і сосны, даводзіцца часта наймаць альпіністаў, каб іх выдаляць. Дзесьці атрымліваецца прыцягнуць да фінансавання мясцовых жыхароў, але часцей за ўсё цяжар цалкам кладзецца на сельсавет. Пасля таго як папрацуюць альпіністы, запрашаем людзей на суботнік. Больш сумленныя прыходзяць, а некаторыя толькі тэлефануюць і скардзяцца, што мы насмецілі. Даводзіцца нагадваць, што клопат пра могілкі — гэта агульная справа. Мы ліквідавалі аварыйную сітуацыю, а вы чым дапамаглі?

> Клопат пра могілкі — гэта агульная справа. Мы ліквідавалі аварыйную сітуацыю, а вы чым дапамаглі?

Апошнім часам з'явілася новая тэндэнцыя. Калі раней людзі прыходзілі прыбрацца на могілкі раз у год — перад Радаўніцай, — то цяпер ідуць круглы год. І нясуць на сметнік і траву, і пясок, і цэглу. Даводзіцца рэгулярна вывозіць горы смецця, а гэта таксама вялікія фінансавыя затраты. Але ёсць і такія, хто сваё смецце зусім не выносіць, а проста адгортвае ўбок. На могілках, вядома, не павесіш фотафіксатары, а значыць, за руку нікога не схопіш. Некаторыя кідаюць на тэрыторыі нават старыя дэмантаваныя помнікі. Такое ўражанне, што чалавек, які заказаў добраўпарадкаванне пахавання сваіх продкаў, не стаў абцяжарвацца тым, каб прыняць работу, якую для яго зрабілі. Добра, калі атрымліваецца знайсці гаспадара, але часта помнік абязлічваецца — адбіваюцца таблічкі, каму ён належаў. І тады вынас аб'ёмістага прадмета робіцца ўжо праблемай сельсавета.

Хацелася б, каб грамадзянская пазіцыя людзей была не спажывецкая, а больш свядомая. Чыста там, дзе людзі наводзяць парадак, не абражаючы памяць тых, чые пахаванні знаходзяцца побач.

Павага перш за ўсё

Старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Алена ШУМЕЙКА прыгадала, як адзін з магілёўскіх рытуальшчыкаў за махінацыі на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай абласцей атрымаў чатыры гады калоніі строгага рэжыму. Чалавек панёс пакаранне, але ж гэта асобна ўзяты выпадак. Праблема, на жаль, засталася.

— Каб не стаць заложнікам махляроў, трэба перад тым, як звярнуцца ў нейкую рытуальную фірму, праманіторыць яе статус і паглядзець водгукі на якасць паслуг, — раіць Алена Шумейка. — Калі шмат негатыву, лепш устрымацца і даверыць свае грошы іншым. Нават калі вы ўпэўнены, што вас не абдураць, не варта ўносіць адразу ўсе грошы за паслугі. Дастаткова перадаплаты, прыняцце якой трэба абавязкова пацвердзіць адпаведным дакументам. Калі якасць работ нізкая або тэрмін выканання заказу зацягваецца, смела шліце выканаўцу пісьмовую прэтэнзію. У крайнім выпадку звяртайцеся ў міліцыю або суд.

А як быць у цэлым з могілкамі? Як растлумачыць чалавеку, што парадак на іх залежыць не толькі ад суседа і так званага балансатрымальніка, а і ад яго таксама? Тут, на жаль, з парадамі цяжэй, бо сумленне — яно або ёсць, або яго няма. Гэта як у вялікім шматпавярховіку, дзе жыве адразу вялікая колькасць народу. Калі ёсць узаемаразуменне і павага да іншых, то і ў пад'ездзе чыста, і ў двары кветкі буяюць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13

Предмет аукциона

Лот, №	Наименование
1	**Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-100264) общей площадью 106,8 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Первомайский с/с, д. Кальчицы, ул. Новины, 5А. Земельный участок общей площадью 0,1048 га предоставлен на праве аренды по 27.02.2039 г. для обслуживания здания магазина
	Начальная цена лота с НДС 20 % – 10 600,00 бел. руб.
2	**Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-74836) общей площадью 98,04 кв. м по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Хорошево, 3. Составные части и принадлежности: сарая (2 шт.), уборная. Земельный участок общей площадью 0,0668 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина
	Начальная цена лота с НДС 20 % – 9 700,00 бел. руб.
3	**Здание магазина № 26 (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-26618) общей площадью 55,0 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Волошево, магазин № 126. Составные части и принадлежности: склад, сарай (2 шт.). Земельный участок общей площадью 0,0422 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживание и эксплуатация строений и сооружений
	Начальная цена лота с НДС 20 % – 5 100,00 бел. руб.
4	**Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) (инв. номер 640/С-84559) общей площадью 286 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/2. **Здание кирпичное (здание неустановленного назначения)** (инв. номер 640/С-84557) общей площадью 40,4 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/1. Земельный участок общей площадью 0,1009 га предоставлен на праве аренды по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий
	Начальная цена лота с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 03.12.2019 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Срок подачи документов: 29.11.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-33527 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Визит»), общей площадью 1410,10 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422050400002002738, площадью 0,2690 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадь – 0,2690 га

Начальная цена продажи – 192 000 руб. (сто девяносто две тысячи рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 19 200 руб. (девятнадцать тысяч двести рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 18 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 14 ноября 2019 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

9 лістапада а 14-й гадзіне
ў пасёлку Глуша
Бабруйскага раёна
адбудзецца адкрыццё першага
ў Беларусі бюста
беларускаму пісьменніку
Алесю Адамовічу.

Даведкі па тэлефонах арганізатараў:
Андрэй 8-029-1238873,
Ванда – 8-044-5326482

ОРША: ПЕРАЗАГРУЗКА

СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

аграрнага сектара Аршаншчыны абмеркавалі на выязным пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама

Удзельнікі дэталёва абмеркавалі, як выконваецца падпраграма «Аграпрамысловы комплекс і лясная гаспадарка» праграмы развіцця Аршанскага раёна на перыяд да 2023 года.

Малочныя рэкі новых фермаў

Перад грунтоўным дыялогам удзельнікі пасяджэння наведалі некалькі сельгасаб'ектаў: першымі сталі малочнатаварныя фермы філіяла «Цяплічны» РУП «Віцебскэнерга», якія стаяць непадалёк ад вескі Стайкі. МТФ на 400 кароў пачала працаваць летам мінулага года, маштабны праект рэканструкцыі рэалізавалі літаральна за год, стварылі 17 рабочых месцаў. Сёння сутачны надой на жывёлу складае крыху больш за 20 кілаграмаў.

Другі аб'ект — новы малочнатаварны комплекс на 1200 жывёл, пабудаваны згодна з Указам Прэзідэнта № 506 «Аб развіцці Аршанскага раёна». Рэалізацыя праекта ўключана ў комплексны план мерапрыемстваў па развіцці гэтага рэгіёна. Кошт рэалізацыі праекта склаў 20,5 мільёна рублёў.

— Аб'ект уяўляе сабой малочнатаварную ферму з замкнёным цыклам аднаўлення статка, — паведаміў **дырэктар філіяла «Цяплічны» Павел ФАМІНОЎ.**

Тут прадугледжана выкарыстанне сучасных тэхналогій у малочнай жывёлагадоўлі: бясприв'язнае ўтрыманне кароў, даенне на рабатызаваных даільных установах з забеспячэннем камп'ютарызацыі працэсаў дойкі, індывідуальнае кармленне кароў і іншыя навінкі.

Увод у эксплуатацыю аб'екта дазволіць павялічыць пагалоўе жывёлы да 2464 галоў, у тым ліку дойнага статку — да 1040 галоў, створыць 33 новыя рабочыя месцы. Аб'ём вырабу малака складзе 7900 тон.

Яшчэ адзін станоўчы прыклад таго, як сельгаспрадпрыемства задумваецца пра будучыню, — гэта рэканструкцыя гаспадарчым спосабам старых фермаў былога саўгаса «Днепр». У двух кароўніках атрымалі прапіску маладыя рагулі, побач месціцца «дзіцячы садок» для цялятак. А яшчэ ў некалькіх старых будынках свінакомплексу цяпер актыўна вядуцца будаўнічыя работы. У перспектыве тут таксама будзе знаходзіцца буйная рагатая жывёла.

Як адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ,** сельгасарганізацыі вобласці маюць зношаную матэрыяльна-тэхнічную базу, таму прынята цвёрдае рашэнне абнавіць яе за кошт будаўніцтва новых малочнатаварных комплексаў і свінакомплексаў і аднавіць тое, што калісьці было кінута.

— І гэта работа ўжо паказала вынікі на прыкладзе Аршанскага раёна, — падкрэсліў губернатар. — Акрамя таго, прынята рашэнне частку новых тэхналогій, якія датычацца гадавання жывёлы: ад маладняка да атрымання цялушак, рэалізаваць у старых памяшканнях, што рэканструююцца і аднаўляюцца, а на новых комплексах стварыць умовы для дойнага статка. Гэта дазволіць паменшыць кошт МТК на 30—40 працэнтаў.

Акрамя таго, у Віцебскай вобласці ўжо налета плануецца грунтоўна абнавіць матэрыяльна-тэхнічную базу сельгаспрадпрыемстваў.

— Мы ставім дастаткова амбіцыйную задачу. На гэта арыентуем кіраўнікоў прадпрыемстваў і старшынь райвыканкамаў, — падкрэсліў Мікалай Шарснёў.

Працаваць над рэзервамі

Сур'ёзная размова па сутнасці справы адбылася ўжо ў райвыканкаме. Старшыня аблвыканкама канстатаваў, што патрэбныя вынікі за мінулыя месяцы не дасягнуты. Паказчыкі растуць у параўнанні з леташнімі, але гэтага недастаткова для паўнавартаснага росту эканомікі і ўзроўню жыцця людзей. У Аршанскага раёна яшчэ шмат пунктаў росту і канцэнтрацыі намаганняў. **Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкама Міхаіл ПРЫДЫБАЙЛА** адзначыў, што ў аграрным сектары Аршанскага рэгіёна дынаміка праглядаецца, але па многіх паказчыках трэба сур'ёзна дапрацоўваць.

— У раёне пры заданні валавога збору збожжавых і зернебабовых культур у аб'ёме 155,3 тысячы тон у амбарнай вазе пры ўраджайнасці 49,7 цэнтнера з гектара сёлета з плошчы 29,9 тысячы гектараў фактычна намалочана 118,1 тысячы тон збожжа ў бункернай вазе. Сярэдняя ўраджайнасць склала 39,5 цэнтнера з гектара, — паведаміў ён.

Што датычыцца валавой вытворчасці малака за студзень—верасень, то яна склала 46 903 тоны, ці 108,5 % да леташняга ўзроўню. Вытворчасць прадукцыі буйной рагатай жывёлы за гэты перыяд складае 5146,4 тоны, ці 103,7 % да ўзроўню 2018-га. На пасяджэнні былі агучаны пытанні павелічэння колькасці пагалоўя, тэмпаў росту валавой прадукцыі, выручкі ад яе рэалізацыі, рэнтабельнасці продажу, прыбытку, аб'ёмаў фінансавання.

На рэзервах акцэнтаваў увагу кіраўніцтва раёна і старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў. Ён вызначыў кола праблемных пытанняў у сельскай гаспадарцы Аршаншчыны, якія неабходна аператыўна вырашыць. Па-першае, вызначыцца з сяўбой тых культур, якія дазволяць атрымаць добры ўраджай, па-другое, рэканструяваць усе старыя памяшканні, па-трэцяе, вырашыць праблему з забеспячэннем кадрамі.

— Напружаная праца і кансалідацыя — складнікі поспеху. Задачы — не на адзін год, а на пяцігодку. Вось формула, па якой трэба працаваць, — падкрэсліў у інтэрв'ю журналістам **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ.**

У сваю чаргу, **старшыня Аршанскага райвыканкама Ігар ІСАЧАНКА** адзначыў:

— Тая дынаміка, якая сёння ёсць у сферы аграпрамыслового комплексу, недастатковая для развіцця раёна. Першачарговая задача — 118,8 % валавая вытворчасць прадукцыі. Сёлета, на жаль, мы не дасягнулі валавой вытворчасці збожжавых 155 тысяч тон. Атрымалі амаль 119 тысяч тон. Можна было за кошт тэхналогій, культуры вытворчасці мець ураджайнасць значна вышэйшую. Што датычыцца жывёлагадоўлі, асаблівую ўвагу трэба звярнуць на прыбаўленне буйной рагатай жывёлы ў вазе, папрацаваць над якасцю малака. Неабходна зрабіць зачын на наступны год. Рэзервы ёсць, трэба над гэтым працаваць.

Па матэрыялах «Аршанскай газеты».

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Открытое акционерное общество «Стеклозавод «Залесье» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

Недвижимого имущества, расположенного по адресу: **Минская область, Вилейский район, п. Партизанский, ул. Ломоносова, 10, в составе: лот № 1** компрессорная станция – 263,9 м², ограждение – ж/б плиты, кабель КЛ – 0,4 кВ; **лот № 2** склад ГСМ – 15,1 м², заправочная – 24,2 м², ограждение – ж/б плиты, емкости – 25 м³; **лот № 3** склад для мазута – 62,9 м², ограждение – ж/б плиты, емкость для хранения битума, емкости – 10 м³, емкость – 15 м³; **лот № 4** проходная – 16,5 м²; **лот № 5** контора – 260,1 м²; **лот № 6** здание склада – 108,0 м²; **лот № 7** кабель КЛ – 0,4 кВ; **лот № 8** ограждение – ж/б плиты, **лот № 9** – забор кирпичный; **лот № 10** ограждение ж/б плиты.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а также подробная информация об имуществе оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайтах: 1) www.minsk-region.gov.by в разделе «Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости); 2) www.molodechno.minsk-region.by/ru/economy/aukcion в разделе «Аукцион»; 3) www.vileyka.minsk-region.by; 4) www.peramoga.by

Аукцион состоится **14.11.2019 г.** в 11.00 по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. 17 Сентября, д. 32. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.11.2019 г.** (включительно) в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу. Тел. +375 29 6853677. УНП 600010636

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а
Предмет аукциона: изолированное помещение № 1 (1–2 этаж) (административное помещение), инв. номер 100/D-73862, общ. пл. 173,8 кв. м, Брестская обл., г. Брест, ул. Задворская, 4	
Начальная цена с НДС 20 %	**26 764,32 белорусского рубля (снижение 80 %)**
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390	
Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона
Условия оплаты предмета аукциона: в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 12.10.2019 г.	
Дата и время проведения аукциона	**13.11.2019** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**11.11.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-27447 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Мебель и техника в быту»), общей площадью 680,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74
Лот № 1 расположен на земельном участке, с кадастровым № 422050400002002567, площадью 0,0984 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Мебель и техника в быту»), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74
Начальная цена продажи – 160 000 руб. (сто шестьдесят тысяч рублей) с учетом НДС
Сумма задатка – 16 000 руб. (шестнадцать тысяч рублей)
Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 18 ноября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.02.2019 г.**
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.
Последний день приема заявлений – 14 ноября 2019 г. до 15.00
Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

РЭПАРЦЁР

ХТО Ў ДВАРЫ ГАСПАДАР?

Як камунальнікі і жыхары тэрыторыю прыбіраюць

Зламаныя граблі і трактары лісця, актыўны адпачынак і штодзённая праца, прага да чысціні і абавязковая адпрацоўка. Мэты ва ўдзельнікаў кастрычніцкіх суботнікаў розныя, а праца для ўсіх аднолькава бясплатная. Ну, за выключэннем сапраўдных дворнікаў, для якіх субота — звычайны рабочы дзень. Як наводзяць парадак у ваенным гарадку Сосны, высвятляла карэспандэнт «МС».

Лістота лепшая за паперкі

На прыборку двароў прыехалі 27 камунальнікаў — яшчэ дзевяці не было. Выгрузілі пясочніцу ды арэлі-балансір, вылажылі граблі — а можа хто з жыхароў далучыцца. На сёння запланавана выграбці лістоту, сухія галіны і смецце каля чатырох дамоў.

Павел ПАПЛЕЎКА, намеснік дырэктара ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска, кажа, што камунальнікі і самі ведаюць, па якіх адрасах трэба дапамагчы, і туды, дзе людзі заяўкі пакідаюць, прыязджаюць.

— Саджаем дрэвы, дадаючы свой унёсак у барацьбу з глабальным пацяпленнем. У мінулую суботу пасадзілі 50 дрэў, сёння ў Шабанах па двух адрасах — яшчэ 21 клён. Выкопваем саджанцы з-пад ліній электраперадачы ў месцах, узгодненых з адміністрацыяй раёна. Кусты яшчэ будзем саджаць.

Тут карысць двайная. Дрэўцы пад правадамі ўсё роўна спілуюць, каб не перашкаджалі, так што ім так і другі шанц даюць на жыццё, і двары азеляняюць. Намеснік дырэктара выходзіць на суботнік кожныя выхадныя кастрычніка — пасада абавязвае, смяецца ён:

— Асабістым прыкладам паказваю, як працаваць.

Людзі старанна грабуць лісце, многія ўсміхаюцца, на мяне рэагуюць жартамі накшталт «сфатаграфуйце і мяне — я маме пакажу».

— Частка нашых у адны выхадныя была, частка — сёння. Усе павінны на грамадскіх работах адпрацаваць хоць бы раз на месяц, — кажа **Іна ХАМЯКОВА, бухгалтар ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска.**

Вольга САВІЧ, дворнік ЖЭУ № 4 Заводскага раёна Мінска, выходзіць на работу а палове сёмай. Да 10.30 яна шчыруе. Пасля двухгадзінны перапынак на абед, і потым ізноў — да паловы чацвёртай. Па суботах графік з сямі раніцы да 12.30.

— Каб толькі лісце замятаць. Мы ж і пад'ёзды мыем-падмятаем, і на кантэйнерных пляцоўках парадак наводзім. Начальства добрае ў нас — выдалі бушлаты, боты, так што і ранкам не так холадна, — адказвае Вольга на маё пытанне. *— Вось толькі абсталяванне часам не вытрымлівае, асабліва пластыкавае. Яго часта толькі на два-тры дні хапае. Мне больш металічныя граблі падабаюцца.*

На маіх вачах у пластыкавых грабляў адвальваюцца зубы — не вытрывалі. Гэта ўжо шаснаццатыя за трэці суботнік, каментуюць камунальнікі.

Арэлевы парадокс

Прыбраўшы тэрыторыю і загрузіўшы смецце ў трактар, паехалі забраць тое, што намялі на суботніку жыхары, — яны ў той дзень прыбіраліся каля дома № 40.

Арэлі-балансір і пясочніцу, прывезеныя, як кажуць камунальнікі, па звароце мясцовых жыхароў, якія скардзіліся, што не хапае гульнявога абсталявання, адвезлі назад — для іх не знайшлося месца.

— Самі ж прасілі на сустрэчы з адміністрацыяй раёна, а як прывезлі — аказалася, усяго хапае, ну як гэта?! — абураецца Павел Паплеўка.

Як здарыўся такі парадокс, тлумачыць **Настасся РЫЖАНКОВА, мясцовая жыхарка-актывістка:**

— Абсталяванне, якое дубліруе тое, што ўжо ёсць, нам непатрэбна, бо яно толькі загрувашчвае двары. Нешта іншае, накшталт скаладрома, канатнай дарогі, паласы перашкод, — іншая рэч. Ёсць сучаснае абсталяванне з цікавымі арэлямі і элементамі. Арэлі-балансір — для зусім маленькіх. Тым, хто больш дарослы, гэта ўжо нецікава. У нас у двары ёсць прыгожая прылада, каб поўзаць, — яе таксама можна мадэрнізаваць, нацягнуўшы нейкія сеткі-канаты. А купляць проста чарговую горку і арэлі — бессэнсоўна.

Пытаюся, чаму б не ажыццявіць свае жаданні за ўласныя сродкі.

— Грошы на добраўпарадкаванне ў камунальнікаў ёсць. Мы за тое, каб яны траціліся больш рацыянальна. Хай лепш гэта будзе нешта адно, але цікавае дзецям, а не трычатыры стандартныя горкі ці лаўкі. Мы за зваротную сувязь і паразуменне.

На суботніку, зладжаным актывісткай, сем дарослых і хіба што не больш дзяцей. Пад музыку, перыядычна частуючыся пячэннем і кісялём ад Настассі, яны з імпэтам збіраюць лісце і фасуюць яго ў смеццевыя пакеты.

— Гэта добры паказчык для пяціпавярховіка, тым больш што многія раз'ехаліся, — кажа актывістка. *— Летась было менш. На жаль, мала людзей, якія лічаць двор сваім. Для іх прыватнае канчаецца за дзвярыма кватэры. Ды і ўзрост тых, хто тут жыве з самага пачатку, ужо дастатковы. Яны сваё адпрацавалі, што называецца. Плюс у нас ёсць гаспадыні кветнікаў. Яны смяюцца, што ўжо свой суботнік правялі — прыбралі кветкавыя ўладанні да зімы.*

— Я не магу не падтрымаць нашу ініцыятыўную суседку ў такіх добрых пачынаннях. Тым больш што я тут жыву, тут пастаянна гуляюць мае дзеці. І калі тут будзе чысціня, ад гэтага ўсе толькі выйграюць, — кажа **Іван, жыхар дома № 40.**

Наталля, жыхарка дома № 40, таксама выйшла на суботнік з дзецьмі. Яе Аліна і Максім ахапкамі цягаюць лісце да пакетаў, што трымаюць дарослыя, з усіх гурбаў, што толькі бачаць.

— Мы выйшлі падтрымаць ініцыятыву і чысціню. Хочам, каб у нас было прыгожа. Ды і дзеці так бачаць, што гэта добрая справа. Пасля яны ўжо і смеціць не будуць, і ўжо нават падбяруць, калі недзе нешта валяецца, і кінуць у сметніцу.

«Пасада» старшага па двары, якую ў Заводскім раёне за верасень — кастрычнік мяркуюць увесці паўсюдна, за Настассяй Рыжанковай пакуль не значыцца, але, мне думаецца, яна першы прэтэндэнт на гэтае месца. Плануецца, што старшыя па двары змогуць наўпрост узаемадзейнічаць з уладамі і даносіць да іх свае патрэбы і праблемы. Жанчына заклікае жыхароў да сумесных спраў на энтузіязме:

— Мала людзей, якім гэта трэба. Грамадзянская супольнасць ў нас пакуль толькі фарміруецца. Людзі пачынаюць разумець, што гэта магчыма, правільна і не сорамна — узаемадзейнічаць на ўзроўні двара. Гэтая думка ёсць у людзей майго пакалення, а да таго людзі проста сядзелі па сваіх хатах і не адчувалі, што гэта належыць ім. У нас жа не пытаюцца, дзе што паставіць: арэлі, лаўку, куст... І мы стараемся сітуацыю выпраўляць, бо пакуль жыхары не адчуваюць, што могуць паўплываць на прыняцце рашэнняў.

КОТГСы — калегіяльныя органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, якія функцыянуюць на добраахвотных пачатках, на думку Настассі Рыжанковай, дублююць існуючую сістэму. А так ЖЭУ не атрымліваюць зваротнай сувязі, і КОТГСы — спроба гэтую сувязь наладзіць. Аднак стымуляваць яе трэба рублём. Гэта павінны быць камерцыйныя структуры, члены якіх абіраліся б жыхарамі-ўладальнікамі і якія задавальнялі б патрэбы жыхароў за іх сродкі.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2019	01.01.2019
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	11 181	11 213
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	61 759	46 357
5	Средства в банках	1104	63 590	47 980
6	Ценные бумаги	1105	82 996	55 086
7	Кредиты клиентам	1106	373 789	344 904
8	Производные финансовые активы	1107	4 614	4 538
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	306	137
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	18 603	18 289
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	10 611	7 026
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	3 281	8 691
13	Отложенные налоговые активы	1112	2	288
14	Прочие активы	1113	4 432	4 907
15	ИТОГО активы	11	635 164	549 416
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	49 375	65 485
19	Средства клиентов	1203	455 123	378 820
20	Ценные бумаги банка	1204	50 110	30 732
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	2 768	2 543
24	ВСЕГО обязательства	120	557 376	477 580
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	27 688	27 688
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	7 153	6 400
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	12 191	12 392
30	Накопленная прибыль	1215	30 756	25 356
31	ВСЕГО собственный капитал	121	77 788	71 836
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	635 164	549 416

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2019	01.10.2018
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	29 694	24 933
2	Процентные расходы	2012	16 557	10 841
3	Чистые процентные доходы	201	13 137	14 092
4	Комиссионные доходы	2021	11 048	8 332
5	Комиссионные расходы	2022	2 388	2 969
6	Чистые комиссионные доходы	202	8 660	5 363
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(365)	(96)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	3 727	6 336
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	5 750	3 108
11	Чистые отчисления в резервы	207	2 781	3 185
12	Прочие доходы	208	5 835	4 180
13	Операционные расходы	209	23 952	21 173
14	Прочие расходы	210	1 608	1 251
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	8 403	7 374
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	1 344	1 988
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	7 059	5 386

Заместитель Генерального директора С. К. Сабук

Главный бухгалтер Н. П. Шнип

Дата подписания: 24 октября 2019 г.

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка: **https://www.bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/**

Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 10 от 11 мая 2019 г. УНП 100513485.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 31 кастрычніка 2019 года.